АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕМ ФІНАНСАВАГА ПЛЯНУ

забяспечым выкананьне пляну вялікіх работ 3-га рашаючага году пяцігодкі

Пралетары ...

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДОЬНЯНЯ—XIV
№ 303 (3901)
НЯДЗЕЛЯ, 28 СЬНЕЖНЯ
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэньнем чацьвярга

Москва, Б-ка ВЦИК СССР Инв.-дек. 7 Экз.-- 1

Па-бальшавіцку біцца за выкананьне фінансавага пляну

Апошні пленум ЦК УсеКП(б) вызначыў на 1931 г. бальшавіцкую праграму сацыялістычнага будаўніцтва. Аб'ём адзінага фінансавага пляну зацьверджан у суме 31,1 млрд. рублёў па даходнай частцы і ў 29,6 млрд. па расходнай частцы, з перавышэньнем даходаў над расходамі і стварэньнем дзяржаўнага рэзэрву ў паўтара мільярда рублёў.

Перад усёй партыяй, перад усімі савецкімі арганізацыямі, перад усёй грамадзянскую стаіць вялічэзная задача ў сэнсе выкананьня вызначанага фінансавага пляну.

Трэба мабілізаваць усе сілы, усе нашы магчымасьці для забесьпячэньня выкананьня вызначанага фінансавага пляну, а значыць і ўсяго пляну сацыялістычнага будаўніцтва на 1931 год.

Трэба цьвёрда памятаць, што «пасьпяховае выкананьне фінансавага пляну і бюджэту стаіць у простай залежнасьці ад выкананьня якасных і колькасных паказальнікаў ва ўсіх галінах народна - гаспадарчага будаўніцтва» і «без строгага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне намечанага гаспадарчага пляну ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі». (З рэзалюцыі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Рад труднасьцяй, якія мелі месца ў грэшовым звароце, былі выкліканы невыкананьнем паасобнымі прадпрыемствамі, трэстамі, гаспадарчымі адзінкамі сваіх плянаў, у прыватнасьці ЯКАСНЫХ паказальнікаў, незахаваньнем рэжыму эканоміі, парушэньнем фінансавай дысцыпліны, што прыяло да дадатковага закрэдытываньня іх органамі дзяржаўнага банку.

Гэтаму рашуча трэба папажыць канец. Нам трэба ўстанавіць самую строгую фінансавую дысцыпліну, рашуча ўзяцца за правядзеньне рэжыму эканоміі. Пленум ЦК сказаў: «Пленум лічыць неабходным рашучае ўзмацненьне работы ўсіх фінансавых органаў, укараненьне самай строгай фінансавай дысцыпліны і рэжыму эканоміі, бязумоўнае выкананьне даходаў, ПАСТАНОЎКУ РАСХОДАЎ КОЖНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ПРОСТУЮ ЗАЛЕЖНАСЬЦЬ АД ВЫКАНАНЬНЯ ЕЮ СВАІХ ВЫТВОРЧЫХ І ФІНАНСАВЫХ ПЛЯНАЎ, умацаваньне чырвонца і рашучае эканомію з недавацэнкай ролі і значэньня фінансавай сыстэмы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва».

Трэба сказаць, што недавацэнка ролі фінансавай сыстэмы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва за апошні час даволі часта мае месца і ва ўмовах работы раду ўстаноў у БССР. Чым іншым можна тлумачыць невыкананьне фінансавага пляну за асобны квартал 1930 г. пры наяўнасьці самых жорсткіх дырэктыў як ЦК КП(б)Б, так і ўраду? Трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што гэта зьяўляецца вынікам недавацэнкі ўсёй важнасьці пытаньня як самой фінансавай сыстэмай, так і радам партыйных арганізацый.

Фінансавы апарат на здолеў па-баявому, па-бальшавіцку перабудаваць сваю работу і надаць гэтай рабоце апэравых характар. Цэлы рад фінансавых органаў пагразіў у права-апартуністычнай практыцы — плацецца ў хвасьце ў сэнсе выкананьня баявых заданьняў, спасылаючыся на «аб'ектыўныя» прычыны.

Даволі падаць прыклад з загадчыкам рэчыцкага райфа: на прапанову Наркамфіну ў бліжэйшыя дні спагнець абавязковыя плацяжы з папярэдзаньнем, што за невыкананьне ён будзе адданы суду (усе тэрміны ўжо прайшлі), ён адказвае наступнай тэлеграмай: «тэлеграму атрымаў, чакаю позвы ў суд. Каму здаць справы», а ў пісьце, паслапым сьледам за тэлеграмай, ён спасылаецца на тое, што невыкананьне заданьня «тлумачыцца аб'ектыўнымі прычынамі, да якіх трэба аднесьці таксама» і паслапую яму тэлеграму. Тут мы маем справу з правай у самай яснай форме правага апартунізму на практыцы. І таму зусім правільна зрабіла камісія ЦК КП(б)Б і СНК, якая санкцыянавала пастанову Наркамфіну аб зьняцьці яго з работы і перадачы справы ў ЦКК КП(б)Б.

Для характарыстыкі становішча з выкананьнем фінансавага пляну за асобны квартал, трэба адзначыць, што на 20 сьнежня 1930 г. дапёка яшчэ ня ўсе раёны поўнасьцю спагналі с.-г. падатак, страхоўку, і асабліва адстаюць у спагнаньні плацяжоў па самаабкладаньні (73 проц.). Яшчэ горш стаіць справа з сыстэмай спажывецкай кааперацыі, якая выканала плян паянакапленьня ў вёсцы на 68 проц. Сыстэма с.-г. кааперацыі, ня гледзячы на тое, што работнікі яе пастановай СНК БССР адданы пад суд за зрыў кампаніі па зборы паёў за мінулы год, і ў гэтым кварталі плятуцца ў хвасьце і фактычна зрываюць плян паянакапленьня. Нездавальняюча стаіць таксама справа са зваротам пазык у сыстэму с.-г. крэдыту. І тут вялікі недабор, які трэба ў бліжэйшы-ж час ліквідаваць. Характэрна адзначыць, што ў той час, калі БЫХАЎСКІ, КЛІМАВІЦКІ, МЕЖЫЦКІ, КРУГЛЯНСКІ, КОХАНАЎСКІ і іншыя раёны выканалі заданьне па с.-г. падатку НА 100 ПРОЦ. Рэчыцкі выканаў—на 79,6 проц., Уваравіцкі—на 79,7 проц., Лоеўскі—на 71,5 проц., Камарынскі—на 81,3 проц. і г. д.

Таксама і па самаабкладаньні—у той час, калі Ветрынскі раён выканаў на 100,3 %, Бешанковіцкі—на 96,8 проц., Чырвонапольскі—на 93,9 проц., Лепельскі—на 95,5 проц., Клімавіцкі—на 91,9 проц., іншыя раёны, у прыватнасьці, Капыльскі—на 29 проц., Чырвонаспабсдзкі—на 33,4 %, Капаткевіцкі—на 36,4 проц. і Рэчыцкі—на 39,7 проц.

Усё гэта гаворыць аб тым, што там, дзе партыйныя камітэты сапраўды пабальшавіцку кіруюць выкананьнем фінансавага пляну, дзе гэта справа знаходзіцца ў цэнтры ўвагі арганізацый—мы маем патрэбныя нам вынікі. У радзе-ж раёнаў, дзе райкомы і райвыканкомы не аддаюць належнай увагі пытаньням мабілізацыі сродкаў насельніцтва, нявыконваюцца дырэктывы ЦК КП(б) Б і ўраду.

У сучасны момант ужо зацьверджаны плян мабілізацыі сродкаў на першы квартал 1931 г. Гэты плян у бліжэйшыя дні будзе даведзены да раёнаў, але трэба за час, які застаўся да канца кварталу, мабілізаваць усе сілы для ліквідацыі прарываў, што ёсьць у выкананьні пляну за асобны квартал, і падрыхтаваць да правядзеньня пляну 1931 г.

Вестні з месц сыгналізуюць яшчэ і аб тым, што гэта кампанія ня ўвязана з кампаніяй па перавыбарах саветаў, у той час, калі апошняя павінна была яшчэ больш узмацніць работу па мабілізацыі сродкаў. Трэба на сходах ставіць пытаньні, зьвязаныя з выкананьнем фінансавага пляну. Партыя катэгарычна патрабуе ад рэённых арганізацый і райвыканкомаў, ад фінансавага апарату прыняцьця самых рашучых мер для поўнага выкананьня вызначанага фінансавага пляну, які зьяўляецца на ўсе 100 проц. рэальным.

Усякая недавацэнка пляну, самацёчныя настроі ў яго выкананьні зьяўляюцца праявамі правага апартунізму на практыцы.

ЦВК і СНК СССР выдана пастанова, у якой ход абкладаньня кулацкіх гаспадарак прызнаецца нездавальняючым і прапануецца ўсім мясцовым органам дадаткова выявіць усіх кулакоў і скончыць работу па выяўленьні і спагнаньні з кулакоў усіх плацяжоў не пазьней 15 студзеня 1931 г. Між тым, у нас у БССР ёсьць яшчэ 7 раёнаў (Бешанковіцкі, Бялыніцкі, Боркавіцкі, Жлобінскі, Журавіцкі, Мазырскі, Прапойскі), якія на сёньняшні дзень ня выявілі ні аднаго кулака. Чым, як не правай апартуністычнай практыкі можна растлумачыць гэтыя факты. Неабходна партыйным і савецкім арганізацыям, у асабліваасьці фінасавым органам выявіць усіх кулакоў і скончыць гэту важнейшую палітычную кампанію да вызначанага ЦВК і СНК СССР тэрміну. Для гэтай работы трэба прыцягнуць бяднацка-сераднацкую грамадзянасьць калгаснікаў, батрацтва.

1-я менская гарпартканфэрэнцыя

Ударнікі—на трыбуне

У Доме Камуністычнай Асьветы імя Карла Маркса сабралася пераважная частка менскай партыйнай арганізацыі. На трыбуну адзін за адным падымаюцца бальшавікі, рападуюць гарпартканфэрэнцыі аб змаганьні партыйных калектываў за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне праміфінплянаў ударнага кварталу. Прамовы напоўнены фактамі, лічбамі посьпехаў, перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Прамоўцы выкрываюць паасобныя правалы, недахопы ў рабоце, рашуча адкідаючы ўсякія спасылкі па «аб'ектыўныя прычыны», паказваючы, што толькі няздольнасьць паасобных вучэек стаць на чале творчага ўздыму рабочых мас, няўменьне падтрымаць ініцыятыву перадавых атрадаў рабочых-ударнікаў—прыводзіць да ганебных правалаў у справе змаганьня за праміфінплян.

Сьцісла па дакладу тав. Гея аб выніках сьнежаньскага аб'яднанага пленуму. ЦК і ЦКК УсеКП(б) абярнуліся ў дэманстрацыю гатоўнасьці менскага партыйнай арганізацыі гэраічна змагацца за новыя перамогі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, у дэманстрацыю поўнай згоды з пастановамі пленуму ЦК і ЦКК аб разгорнутым сацыялістычным наступленьні, аб няўхільнай барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі з наскокамі на лінію партыі справа і «зьлева».

Старшыня прэзыдыуму абвяшчае, што дэлегацыі рабочых менскіх заводаў і фабрык, асьветнікаў, камсамолу прышлі вітаць партыйную канфэрэнцыю. У залю са сьцягамі, плякатамі уваходзяць шматлікія дэлегацыі.

— Шчырае прывітаньне бальшавіцкай канфэрэнцыі!

— Датэрміновае выкананьне праміфінпляну па 100 проц.—наш падарунак гарпартканфэрэнцыі.

— Гонар камсамольскага агрэгату—пераходны сьцяг за датэрміновае выкананьне праміфінпляну ўдарнага кварталу—крычаць плякаты рабочых дэлегацый.

Дэлегацыі праходзяць праз залю, разьмяшчаюцца на сцэне, ля трыбуны. На трыбуне тав. Лугаўскі—рабочы чырвонаармейскай фабрыкі «Кастрычнік».

— Вітаю партыйную канфэрэнцыю на даручэньні 2.000 рабочых. Мне рабочыя даручылі заявіць, што фабрыка к часу адкрыцьця гарадзкой канфэрэнцыі праміфінплян асобнага кварталу выканана на 100 проц. Дні, якія засталіся да пачатку трэцяга году пяцігодкі, намі будуць максымальна скарыстаны для перавыкананьня праміфінпляну асобнага кварталу. Праз вытворчыя манэўры, мы ў трэці год уступім падрыхтаванымі і даведзем, што мы здольны змагацца за генэральную лінію партыі.

Канфэрэнцыя горача спаткала паведамленьне аб новай перамозе рабочага калектыву фабрыкі «Кастрычнік». Рабочыя «Кастрычніка» ўжо ня раз паказвалі ўзоры бальшавіцкай работы, ня раз пацьвярджалі сваю адданасьць сацыялістычнаму будаўніцтву і ленінскай партыі. Таму канфэрэнцыя на трыбуне вітала не Лугаўскога, а двухтысячных рабочых калектыў, які кожнае сваё слова ў довад адданасьці бальшавіцкай партыі падмацоўвае новымі перамогамі, канкрэтнай работай на пабудове сацыялізму.

У залю прышлі рабочыя масы, каб запэўніць свой авангард—ленінскую партыю—у сваёй гатоўнасьці ісьці па шляху, які вызначыў Ленін, аддаючы ўсе свае сілы, напружваючы волю і энэргію на перамогу труднасьцяй, на няўхільнае прасоўваньне наперад. Якой нікчэмнай робіцца балбатня правых і «левых» апартуністаў аб «адарванасьці партыі ад рабочае класы, аб загаданьні рабочай актыўнасьці», аб тым, што «пяцігодка ня можа быць выканана».

Ад 1.000 маладых рабочых фабрыкі «Кастрычнік» канфэрэнцыя заслухала рапарт т. Каганцова.

— Наш камсамольскі агрэгат, які атрымаў за добрую работу пераходны сьцяг ад парткалектыву, сёньня а 11 гадз. свой праміфінплян выканаў цалкам. Пераходны сьцяг мы нікому не аддамо! Мы пакажам і ў будучым лепшыя ўзоры бальшавіцкай работы.

Завод «Энэргія» на працягу доўгага часу меў вялікія прарывы ў выкананьні праміфінпляну. У асобным квартале становішча рэзка зьмянілася, вось аб гэтым і гаварыў у сваім рапарце тав. Азаркевіч.

— Насыпаючы мяне сюды, рабочыя далі наказ, каб я паведаміў партыйную канфэрэнцыю, што сустрэчны праміфінплян, які рабочымі быў прыняты на асобны квартал з разьлікам выпусьціць прадукцыі на 1.275.000 руб.—заводам выкананы. Канфэрэнцыя ўдарнікаў заводу, прыняўшы пастанову, каб да 25-га сьнежня выканаць праміфінплян 1 апошнія дні сьнежня скарыстаць на перавыкананьне праміфінпляну—сваю пастанову поўнасьцю выканала.

24-га сьнежня а 2 гадз. дня брыгада тав. Бурэйка першая вывесіла чырвоны сьцяг аб сваёй буйнай перамозе, аб датэрміновым выкананьні праміфінпляну. Потым праз некалькі гадзін зьявіліся чырвоныя сьцягі над другімі пахамі. Сёньня падняты апошні чырвоны сьцяг—вястун перамогі нашага чырвонасьцяжнага заводу.

Чым абумоўлены наш посьпех? Мы выявілі, што, пачынаючы ад дырэктара і канчаючы майстрам—замест бальшавікоў мы мелі шмат гнілых апартуністаў. І вось рабочыя бальшавіцкай мятлой вымелі гэтых апартуністаў і на іх месца высунулі рабочых ад варштату. Вынік, як бачыце, — ня дренны.

Заяўляю, што праміфінплян у трэцім годзе нашым заводам будзе выкананы пабальшавіцку.

Выступленьне рабочага тав. Азаркевіча канфэрэнцыяй было спаткана вялізарным уздымам таму, што рабочыя заводу «Энэргіі», выкінуўшы гнілых апартуністаў, паказалі новы ўздым творчага энтузіязму, пры дапамозе якога прышлі да вялізарных посьпехаў.

На трыбуне тав. Ушакова, работніца шчотачнай фабрыцы імя Крупскай.

— 28-га сьнежня ў нас будзе апошнім днём ударнага кварталу. У гэты дзень мы закончым выкананьне праміфінпляну...

Тав. Ушакова гаворыць аб тым, што рабочыя і работніцы фабрыкі ў адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць «прампартыі», на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу, прынялі пастанову аб выкупе аблігацый пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» замест 10 месяцаў за 6 месяцаў.

— 30 лепшых работніц і рабочых ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Тав. Цымэрман зачытаў заяву аб уступленьні ў партыю 10 рабочых-ударнікаў Велдзяржаўбуду.

Да позьняй ночы канфэрэнцыя слухала рапарты аб посьпехах у выкананьні пяцігодкі за чатыры гады. На трыбуне зьмяняліся прамоўцы, дэлегацыі, але ўсе яны гаварылі толькі аб адным, усе яны падавалі лічбы і факты, — перамогі сацыялістычнага будаўніцтва над капіталістычнымі элементамі, перамогі рабочае класы над выпрабаваным кіраўніцтвам свайго авангарду — ленінскай партыі.

Уп. Зьв.

Саўгасы і калгасы ПАВІННЫ

рапартуюць Усебеларускаму зьезду саветаў аб поўнай падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы

ПАСТАНОВА САЮЗНАГА НАРКАМЗЕМУ

Наркамзем СССР выдаў пастанову аб тэрмінах правядзеньня асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Паводле гэтай пастановы САВЕЦКІ САЮЗ у адносінах тэрмінаў правядзеньня паказаных мерапрыемстваў ПАДЗЯЛЯЕЦЦА НА ТРЫ ГРУПЫ.

БССР АДНЕСЕНА ДА ДРУГОЙ ГРУПЫ РАЗАМ З ЛЕВЫМ І ПРАВЫМ УЗЬБЯРЭЖЖАМІ УКРАІНЫ, ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЧОРНАЗЕМНАЙ ВОБЛАСЬЦЮ, СЯРЭДНЯ-ВОЛСКІМ КРАЕМ, ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦЮ І АССР.

ДЛЯ БССР УСТАНОЎЛЕНЫ НАСТУПНЫЯ КАНЧАТКОВЫЯ ТЭРМІНЫ ДЛЯ СКАНЧЭНЬНЯ АСНОЎНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

ДАВЯДЗЕНЬНЕ ПЛЯНУ засеву да калгасу, сяла і адзіноасобнага двара павінна быць скончана ДА 1 ЛЮТАГА 1931 Г., АРГАНІЗАЦЫЯ НАСЕННЫХ калгасных фондаў — 75 проц. заданьня ДА 1 ЛЮТАГА 1931 Г., РЭШТА ДА 15 САКАВІКА 1931 Г.

Абагуленьне насенных фондаў у калгасах, якія арганізуюцца, а таксама і ў новых калгасьніках, якія ўступяць ў існуючыя калгасы пасьля выданьня пазазанай пастановы, праводзіцца адначасова з арганізацыяй калгасаў і прыёмам новых членаў. ДА 15 СТУДЗЕНЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАВЕРАНЫ ВЫДЗЯЛЕНЬНЕ СТАРЫМІ КАЛГАСАМІ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ І ПАРАДАК ІХ ЗАХАВАНЬНЯ.

ТЭРМІН ЗБОРУ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ УСТАНОЎЛЕНЫ Ў АДЗІНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ — 1 ЛЮТАГА 1931 Г.

ВЫДЗЯЛЕНЬНЕ БРАНІЯВАНЫХ ФУРАЖНЫХ ФОНДАЎ для веснавой сяўбы ў калгасах БССР паводле пастановы НКЗ Саюзу ПАВІННА БЫЦЬ СКОНЧАНА ДА 15 ЛЮТАГА 1931 Г.

АБМЕН НАСЕННЫХ ФОНДАЎ на гатунковае насеньне правесьці ў зімовы пэрыяд ДА 1 САКАВІКА 1931 Г.

РАМОНТ ТРАКТАРАЎ НЯ МЕНШ 75 ПРОЦ. ПАВІНЕН БЫЦЬ СКОНЧАНЫ ДА 1 САКАВІКА 1931 Г., РЭШТА ДА 1 КРАСАВІКА 1931 Г.

Зямляўказаньне і зямляадводы скончыць не пазьней як праз 2 тыдні да пачатку сяўбы.

Заданьне па зборы калгаснага фонду насеньня ўстаноўлена па СССР у 309 міл. цэнтнэраў, а па зборы страхавых фондаў з калгасаў і адзіноасобных гаспадарак — 27,7 міл. цэнтнэраў.

КАНЧАТКОВАЕ ЗАДАНЬНЕ ЯРАВОГА ПАСЕВУ ДЛЯ БССР УСТАНОЎЛЕНА Ў 2 МІЛ. 698 ТЫСЯЧ ГЭКТАРАЎ.

Саюзны Наркамзем забараніў Наркамзамам рэспублік і краявым і абласным земельным кіраўніцтвам уносіць якія-б там ні было зьмены ў боі заданьняў, як у адносінах тэрміну выкананьня, так і разьмераў.

15 лютага — Усебеларуская праверка падрыхтаванасьці трактараў і машын у калгасах да веснавой сяўбы

Праўленьне Белкалгасцэнтру БССР, вітаючы пачынаньне Атаманаўскай МТС, парашыла скарыстаць мерапрыемствы, высунутыя рамонтнай майстэрняй Атаманаўскай МТС з мэтай фарсаваць рамонт трактараў, сельска-гаспадарчых машын і прылад калгаснай сыстэмы.

Шырока разгортваючы падрыхтоўку да сяўбы ў калгасах на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, Калгасцэнтр прапануе калгасам скончыць рамонт да тэрміну, які вызначаны Саюзным Наркамземам, г. зн. да 15-га лютага.

Да 15-га лютага арганізуецца Усебеларуская праверка падрыхтаванасьці трактарнага парку, с.-г. машын і прылад калгасаў да веснавой сяўбы.

Калгасцэнтр ставіць перад сваёй сыстэмай задачу — рапартаваць Усебеларускаму зьезду саветаў, скліканаму якога намячаецца ў канцы лютага, аб поўнай падрыхтаванасьці калгасаў БССР да другой бальшавіцкай весны.

Для забесьпячэньня выкананьня гэтай задачы ўжыты наступныя канкрэтныя мерапрыемствы:

У раёны накіроўваюцца 28 адказных работнікаў Калгасцэнтру і 100 студзэнтаў старэйшых курсаў Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, на якіх ускладаецца абавязак практычна дапамагчы калгасам у правядзеньні падрыхтоўкі.

Кожны калгас павінен неадкладна арганізаваць спэцыяльную рамонтную брыгаду і вылучыць адзнаку з членаў праўленьня, на якога ўскладаецца адказнасьць за своечасовае сканчэньне рамонту.

Апрача таго, у калгасе павінна быць створана спэцыяльная дапаможная брыгада, якая займецца мабілізацыяй унутраных рэсурсаў (зборам жалеза, старых частак) і падрыхтоўкай рамонтных матар'ялаў (дрэва, варонак і г. д.).

БОЛЬШ

ГЭКТАРАЎ ПАД ЗЯБЛІВА

Мерапрыемствы па забесьпячэньні росту зяблева

МАСКВА, 23. У мэтах забесьпячэньня захаваньня росту зяблева ў сельскай гаспадарцы і гужавым транспарце, — СНК СССР пастанавіў прапанаваць мясцовым саветам правесьці растлумачальную работу сярод шырокіх мас бяднацка - сераднацкіх гаспадарак, у асаблівасьці на лініі МТС аб зкачэньні цяганай сілы пры наяўнасьці трактараў, шырока азнаёміць калгаснікаў з прыкладным дагаворам МТС з калгасам.

Забараняецца ўжываньне працуючых павінасьці, апрача патрэб абслугоўваньня тованк, дарожнага будаўніцтва і ваеннага ведамства. Ужываньне працуючых павінасьці, тэрмін расплаты за яе адлегласьць павінны быць упарадкаваны.

Забараняецца ўбой на мяса коннага маладняка і рабочых коняй, апрача яўна нягодных да гаспадарчай працы. У адносінах парушальнікаў рабочых выканкомы павінны ўжываць штраф у разьмеры дзесяціразовай каштоўнасьці забітай жывёлы па мясцовых дзяржаўных загатоўчых цэнах, а ў адносінах да найбольш злосных кулацкіх элементаў, апрача таго, канфіскацыю усяе належачай ім маёмасьці.

СНК ухвалена пастанова Наркамзему СССР і Калгаспэнтру аб павышэньні адпічэньняў у карысьць калгасьніка ад заработку на рамізьніцкіх і песазагатоўчых работах да 50 проц., калі калгасьнік карыстаецца належачымі калгасу кормам, і да 70 проц., калі ён корміць коняй сваімі кармамі.

„Расія зрабіла цуда"

СТАМБУЛ, 26. Як паведамляюць з Індыі, у нацыяналістычнай газэце «Гіндустан Таймс» зьмешчана інтэрв'ю са славутым індыйскім паэтам Рабіндранат Тагорам. «Расія зрабіла цуда», — сказаў Рабіндранат Тагор. — У Маскве я ўпэўніўся ў тым, што руская сялянне і рабочыя павышаюць ня толькі сваю тэхнічную кваліфікацыю, але і свой культурны ўзровень. Шырокія народныя масы запаўняюць тэатры, канцэртныя залі і музэі. Тое, што ажыцьцёўлена ў Расіі за пошпія 8-10 год, прадстаўляецца нам індыйцам, сапраўдным цудам. Пры царскім рэжыме народныя масы ў Расіі былі настолькі неўцямкімі і цёмнымі, як індыйскія народныя масы ў наш дні. У Індыі ўсяго 5 проц. насельніцтва зьяўляецца пісьменнымі. Пры царызьме расавая і рэлігійная варожасьць была ў Расіі такім-жа штодзённым зьявішчам, як і ў сучаснай Індыі. Зараз у Расіі ўсе гэтыя зьявішчы зусім зьніклі. «Расія сапраўды зрабіла цуда».

ДРОВА МЕНСКУ

НА СТАНЦЫЯХ—ПРОБКІ

Раёны, вызначаныя для забесьпячэньня Менску дровамі злачынна марудзяць

Хойнікі, Глуск, Рагачоў яшчэ не прыступілі да адгрузкі

Без перамен

Дырэктыва ЦК і ЦКК КП(б)Б аб пасказрэньні адгрузкі дроў для Менску ўсё яшчэ ня выконваецца. Замест штодзённай адгрузкі 100 вагонаў 27-га атрымана 40 вагонаў, з якіх 25 вагонаў са ст. Бабруйск.

Хойнікі, Глуск і Рагачоў яшчэ ня прыступілі да адгрузкі дроў для Менску. У радзе раёнаў адгрузка тармазіцца адсутнасьцю вагонаў. Чыгуначная адміністрацыя па ўлічыла важнасьці забесьпячэньня Менску дровамі. Такое становішча нельга расцэньваць інакш, як апартуністычную бязьдзейнасьць паасобных партыйных і савецкіх арганізацый.

Мясцовыя партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі вылучаных раёнаў для адгрузкі дроў для Менску, павінны зараз-жа мабілізаваць увагу партыйнага, прафэсыянальнага і савецкага актыву, ужыўшы рашучыя меры да тых, якія тармозяць своечасовую адгрузку дроў для Менску.

Пракуроры па мясцох павінны праверыць і ўзяць пад свой нагляд ход выкананьня дырэктывы партыі і ўраду.

Рэчыцкія абломавы

РЭЧЫЦА. (Па тэлеграфу). 26-га сьнежня Рэчыцкі лесапрамгас адгрузіў для Менску 30 вагонаў дроў, а 27 сьнежня адгружана ўсяго 9 вагонаў. Прычыны невыкананьня — адсутнасьць рабочай сілы. Раённыя арганізацыі бязьдзейнічаюць. Выкананьне нараду па адгрузцы дроў для Менску—пад пагрозай зрыву.

Зоываюць адгрузку

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). 26-га сьнежня бабруйскі лесапрамгас адгрузіў для Менску 10 вагонаў дроў. На 27 сьнежня для адгрузкі дроў для Менску патрэбна было: Бабруйску—20 вагонаў, ст. Бярозіна—10 вагонаў, ст. Варыпны—30 вагонаў. З-за нядбайных адносін чыгуначнай адміністрацыі вагоны ня былі паданы, з прычыны чаго 27 і 28 не адгружана ніадна вагону.

Вінаеата чыгуначная адміністрацыя

КАЛІНКАВІЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). НА СТ. КАЛІНКАВІЧЫ, ПЕТРЫКАЎ І ЕЛЬСК СКАПІЛАСЯ ШМАТ ДРОЎ, ПРЫЗНАЧАНЫХ ДЛЯ АДГРУЗКІ Ў МЕНСК. ДРОВЫ НЕ АДГРУЖАЮЦЦА З ПРЫЧЫНЫ НЕПАДАЧЫ ВАГОНАЎ. НА НЕАДНАРАЗОВЫЯ ПАТРАВАНЬНІ ЛЕСАПРАМГАСАЎ АБ ПРАДАСТАЎЛЕНЬНІ ВАГОНАЎ. ЧЫГУНАЧНАЯ АДМІНІСТРАЦЫЯ ГЭТЫХ СТАНЦЫЙ НІЧОГА НЕ АДКАЗВАЕ І НЯ ЎЖЫВАЕ НІЯКІХ МЕР ДЛЯ ХУТЧЭЙШАЙ ПАДАЧЫ ВАГОНАЎ.

ГОЛАС МІЛЬЁНАЎ

патрабуем вышэйшай меры пакараньня наймітам польскага фашызму

Беларуская сэкцыя ЛАПП выказвае сваё абурэньне і пратест супроць контр рэвалюцыйнай дзейнасьці беларускіх нацыянал - дэмакратаў, якія імкнуліся шляхам інтэрвэнцыі зьнішчыць Савецкую Беларусь і абярнуць яе ў калёнію польскага фашызму.

Прымазаўшыяся да пралетарскай дыктатуры, контр - рэвалюцыянары—Смолічы, Цьвікевічы, Лёскі і К° выконвалі даручэньні польскага імэрыялізму.

Мы абяцаем пралетарскі шырокую кампанію сярод працоўных беларусоў г. Леніна па выкрыцьці сутнасьці контр - рэвалюцыйнай дзейнасьці прадажных служак польскага фашызму. Сваёй творчасьцю выхаваць у працоўных яшчэ большую клясавую варожасьць да сусьветнага, імэрыялізму, які ліхаманкава рыхтуецца да нападу на адзіную ў сьвеце бацькаўшчыну пралетарыяту—СССР.

Мы патрабуем суровага пакараньня наймітаў польскага фашызму. Мы патрабуем узнагароды ДПУ Беларусі ордэнам Леніна.

Члены Беларускай Сэкцыі ЛАПП: ПІВАВАРАЎ, КОБЭЦ, ПЯТРОЎСКІ, ПАПАРАЦЬ, СУЛЕР, ШАРАХОЎСКІ, ПУШКАРЭВІЧ, КАБЗАРЭЎСКІ, ДОБКІН, КАПЫЛКОЎ, ЗІНА КАГАНОВІЧ, ЗЯНЬКОВІЧ.

— У Чарэйскім раёне на ўсіх вгульных сходах калгасьнікі патрабуюць суровага пакараньня для контр - рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў і адначасова дамагаюцца ўзнагароды ДПУ Беларусі ордэнам Леніна.

У адказ на контр - рэвалюцыйную дзейнасьць беларускіх нацдэмаў, калгасьнікі абяцаюць:

Своячасова і поўнасьцю падрыхтавацца да веснавой сяўбы, пашырыць яравы клін у 1931 г. на 25 проц. супроць 17,4 проц., вызначаных плянам, выканаць на 100 проц. плян па засеве тэхнічных культур, — датэрмінова выплаціць пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».

Калгасьнікі ўхваляюць пастанову раённай нарады старшынь калгасаў у справе збору сродкаў на пабудову дырыжабля імя «Правды», пры гэтым калгасьнікамі ўжо сабрана 493 рублі 87 кап. Збор сродкаў працягваецца.

— Заслухаўшы даклад аб контр - рэвалюцыйнай дзейнасьці беларускіх нац дэмаў, сход слухачоў вячэрняй школы калгаснай моладзі і сход моладзі вёс. Забалоцьце, Перажырскага сельсавету, выносіць пратест і патрабуе вышэйшай меры пакараньня для ўсёй групы нацдэмаў.

Сход вітае тернага вартавога рэвалюцыі — ДПУ Беларусі і хадайнічае перад урадам БССР аб узнагародзе ордэнам Леніна.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацдэмаў, сход пастанавіў, арганізаваць калгас у вёс. Забалоцьце, узмацніць заняволаную сярод насельніцтва, арганізаваўшы ячэйку Асоавіяхіму.

Пазыка „Пяцігодка—за чатыры гады"

НІ КРОКУ НАЗАД АД БАЯВОГА ЗАДАНЬНЯ!

ДА 1 СТУДЗЕНЯ ПОУНАСЬЦЮ РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАЗЫКУ НА ВЁСЦЫ

„Бяз суровага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне вызначанага гаспадарчага пляну па ўсіх галінах народнае гаспадаркі"

(З пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

НА ШТУРМ

ПРАРЫВАЎ У ФІНАНСАВАЙ РАБОЦЕ

(Гутарка з упаўнаважаным ЦК УсеКП(б) тав. В. П. МІЛЮЦІНЫМ)

Да сканчэньня асобнага кварталу і да пачатку новага году засталося некалькі дзён. Таму трэба зрабіць усё магчымае для таго, каб закончыць належным чынам асобны квартал, узяць бальшавіцкія тэмпы гаспадарчай работы ў першы-ж месяц новага году.

У БССР, побач з дасягненьнямі, бясспрэчна, ёсьць рад вельмі буйных недахопаў, на якія трэба зьвярнуць самую сурёзную ўвагу і ўзварушыць, каго належыць.

Асаблівую ўвагу трэба аддаць мабілізацыі фінансавых сродкаў і прасоўваньню прамтавараў да спажыўца. Затрудненьні, якія ёсьць у гэтай галіне, залежыць выключна ад неарганізаванасьці, а часта ад галавацяпства нашых устаноў і арганізацый. Дрэнна працуе кааперацыя. У яе няма гібкасьці, плянавасьці і настойлівасьці ў рэалізацыі тавараў. У выніку—залежы і псаваньне тавараў на складах, дрэнная забесьпячэньне спажыўца.

У галіне фінасавай работы звяртае на сябе ўвагу ў радзе раёнаў пенастарчальнае выяўленьне кулакоў і спагнаньне з іх запазычанасьці. Гэта —праяўленьне правага апартунізму на практыцы. Сельска-гаспадарчая крэдытная сыстэма не даволі энэргічна працуе, дрэнна мабілізуе сродкі. Гэта выклікана скрозь і ўсюды няправільнымі, а-бы сказаў, нясур'ёзнымі адносінамі да ролі і значэньня фінансаў з боку нашых гаспадарнікаў. З падобнымі адносінамі трэба пакончыць. Трэба ліквідаваць затрыманьні паступленьняў грашовых сродкаў.

Работа нашых арганізацый і ў асаблівасьці кааперацыі "павінна быць пастаўлена пад глыбокі партыйны і грамадзкі кантроль.

Плян мабілізацыі сродкаў выкананы толькі на 73,8 проц.

Пакончыць з апартуністычнымі адносінамі да баявога заданьня

Паводле даных Наркамфіну БССР, плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва на ўдарны квартал выкананы ў разьмеры 73,8 проц. (на 20 сьнежня).

Трэба было сабраць 55.446.000 руб., сабрана 40.977.000 руб.

Слаба зьбіраюцца абавязковыя плацяжы насельніцтва. Так, плян збору адзінага сельска-гаспадарчага падатку выкананы толькі на 89,2 проц., іншых непасрэдных падаткаў—на 166,1 проц., страхоўкі—123,4 проц., самаабкладаньня—толькі на 73 проц.

Дрэнна спагняецца падатак, страхоўка і сумы па самаабкладаньні з кулацкіх гаспадарак. Даюць

Заваяваць вышыні трэцяга году пяцігодкі

СУПРОЦЬ АГЕКТУРЫ КАНДРАЦЬЦЕУШЧЫНЫ Ў ПАРТЫ

Мы ўжо ў «Зьвязьдзе» сыгналізавалі аб правааапартуністычных памылках у аграрных навукова-даследчых і палітычных працах т. Маргелава. У рэцэпзіі тав. Пічуга аб кнізе Маргелава: «Вроварная прамысловасьць і яе штандарт на тэрыторыі сучаснай БССР», зьмешчанай у «Зьвязьдзе», мы выявілі сутнасьць апортуністычных установак т. Маргелава. На спэцыяльным сходзе аграрнікаў-марксыстаў, скліканым партаддзелам «Зьвязды», падрабязна крытычнаму разьбору і ўсе іншыя працы тав. Маргелава. У выніку гэтай нарады аграрнікаў-марксыстаў пры «Зьвязьдзе» работы тав. Маргелава разглядаліся і на ячэйцы БНДІ.

Пад уплывам крытыкі на старонках «Зьвязды» і ячэйкі т. Маргелаў быў прымушаны выступіць з самакрытыкай.

У «Зьвязьдзе» ад 20 сьнежня быў апублікаваны яго адкрыты ліст, у якім т. Маргелаў **у аснoўным здавальняюча** вынёс і раскрытыкаваў свае памылкі. Апрача заявы т. Маргелава, рэдакцыя зьмясьціла таксама выпіску з пратаколу ячэйкі па пытаньні аб заяве т. Маргелава.

Трэба адзначыць, што на бюро ячэйкі адзначаны яго адкрыты ліст, якім бюро ячэйкі не аддало патрэбнай увагі. Тав. Маргелаў у папулярнай брашуры «Калгас—адзіны шлях сялянства», выданай у 1930 г., свае старыя памылкі дапоўніў новымі, з якіх найбольш сур'ёзнай зьяўляецца тэорыя аб трох шляхох разьвіцьця сялянскай гаспадаркі: капіталістычны шлях, сацыялістычны і шлях заціханьня. У гэтай сваёй брашуры т. Маргелаў стаў на пункт погляду правага ўхілу і ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва. Таму Фрунзаўскі раённы камітэт партыі, разглядаючы справу аб памылках т. Маргелава ў сувязі з пастановай ячэйкі БНДІ, адзначыў несваячасовае і нерашучае рэагаваньне бюро ячэйкі на навукова-даследчыя і палітычныя працы т. Маргелава, якія «прадстаўляюць сабой цэлую сыстэму апартуністычных, варожых марксызму-ленінізму поглядаў, якія поўнасьцю стаяць на пляцформе правага апартунізму і змыкаюцца з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам у тэорыі і практычнай дзейнасьці».

Характэрна, што бюро ячэйкі, падаючы пра гэту пастанову Фрунзаўскага райкому партыі, ня лічыла патрэбным паведаміць аб ёй ЦО партыі, хаця сваю няпоўную і, як выявілася, несдавальняючую рэзалюцыю, пакіравала ў «Зьвязду» для надрукаваньня. Гэтага нельга расцэньваць інакш, як спробу замазаць памылкі Маргелава, як сьвядомае ці несьвядомае прыміраніцтва да памылак Маргелава, бо бюро ячэйкі ведала аб **новых фактах** у справе Маргелава («тэорыя трох шляхоў разьвіцьця сялянскай гаспадаркі») і ня лічыла неабходным сыгналізаваць аб гэтым ЦО партыі. Гэта тым больш памылкова, што ячэйка добра ведала аб тым, з якімі труднасьцямі т. Маргелаў пад націскам крытыкі на нарадзе ў «Зьвязьдзе» ішоў на прызнаньне і асуджэньне сваёй праваапартуністычнай сыстэмы поглядаў.

Ніжэй мы даем рэзалюцыю Фрунзаўскага райкому партыі, якая падводзіць вынікі барацьбы, пачатай «Зьвяздой» за выкрыцьцё і вымярыцьцё антыпартыйнай сыстэмы поглядаў т. Маргелава.

Аб памылках у працах таварыша Маргелава (ячэйкі БНДІ)

Рэзалюцыя бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Пасьляховае сацыялістычнае будаўніцтва, рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі па ўсім фронце, ліквідацыя кулацтва як класу на базе суцэльнай калектывізацыі—выклікае шаленую нянавісьць і супраціўленьне клясавых ворагаў.

Абостраная клясавая барацьба разгортваецца і выяўляецца ня толькі ў падрыве нашага гаспадарчага будаўніцтва, рабочага забесьпячэньня, у стварэньні контр-рэвалюцыйных арганізацый для правядзеньня шкодніцкай работы і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі сумесна з капіталістычнымі дзяржавамі і іх генэральнымі штабамі—супроць СССР, але ў ня меншай меры і вострасьцю адбываецца клясавая барацьба на навукова-культурным фронце.

Шкодная праца на навуковым фронце газгортваецца на лініі затрыманьня падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, па лініі абароны, падтрыманьня і прапагандаваньня варожых марксызму тэорыя. У сваёй працы буржуазныя вучоныя ставілі стаўку на разьвіцьцё нашай гаспадаркі на капіталістычным шляху, складалі і абаранялі ў адзіноасобіцы з гэтым тэорыю трэцяга разьвіцьця, абгрунтоўвалі і распаўсюджвалі сваёму ўплыву рад месцаў устойлівых камуністаў.

Тав. МАРГЕЛАЎ, працуючы ў БНДІ пад кіраўніцтвам пацдэма Г. ГАРЭЦКА-ГА, ня толькі ня вёў рашучай барацьбы ў тэорыі і практычнай дзейнасьці з контр-рэвалюцыйным нац.-дэмакратызмам; але сам цалкам падпаў пад яго ўплыў і пераходзіў у сваіх навуковых працах буржуазным, антымарксыцкім, анты-ленінскім поглядам, абараняючы і прапагандаючы рэакцыйны тэорыі буржуазных эканамістаў (Вэбэр) па эканоміку нераходнага перыяду.

(«Да пытаньняў аб штандардзе». «Праблема ўраджайнасьці», «Да пытаньня аб штандарце баконных заводаў...» і т. д.).

У папулярнай брашуры «Калгас—адзіны шлях сялянства», выд. у 1930 г. і прызначанай для калгаснікаў і бядняцка-сераднякоў мас сялянства, т. Маргелаў ня толькі ня выправіў сваіх мінулых памылак, але даваў новыя (тэорыя трох шляхоў разьвіцьця сялянскай гаспадаркі: «капіталістычны, сацыялістычны, асобны») і ўпна стаў на пункт погляду правага ўхілу ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Тав. Маргелаў у папулярнай брашуры за апошні месяц «Супроць беларускай кандрацьцеўшчыны» па цэлым радзе пытаньняў праводзіць нацыянал-апартуністычную лінію ў сваёй працы, вяручы пад абарону контр-рэвалюцыйных нац.-дэмакратаў (Смоліч, Гарэцкі і інш.).

Усе навукова-даследчыя і палітычныя працы тав. МАРГЕЛАВА прадстаўляюць **сабою цэлую сыстэму апартуністычных варожых марксызму-ленінізму поглядаў, якія поўнасьцю стаяць на пляцформе правага апартунізму і змыкаюцца з контр-рэвалюцыйным нац.-дэмакратызмам у тэорыі і практычнай дзейнасьці.**

Тав. МАРГЕЛАЎ, замест своячасовага прызнаньня сваіх права-апартуністычных памылак, асуджэньня буржуазных анты-марксыцкіх, антыленінскіх поглядаў і рашучага выкрыцьця да канца палітычнай шкоднасьці іх—праводзіў двурушніцкую палітыку: пад націскам крытыкі, прызнаўшы і абапяваўшыся выступіць з крытыкай сваіх палітычных памылак, ня гледзячы на магчымасьць тав. МАРГЕЛАЎ да гэтага часу нічога не зрабіў.

Бюро яч. НДІ, ня гледзячы на сыгналізацыю з боку члена бюро яч. тав. ГАЛІНА замест разгортваньня самакрытыкі і рашучай барацьбы з права-апартуністычнымі поглядамі Маргелава, мабілізацыі партыйных і беспартыйных мас на барацьбу з правым апартунізмам і контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам—цягнулася ў хвасьце, а пры разглядзе справы Маргелава не дала палітычнай ацэнкі справе, праводзячы прымірэнцтва да пагляду Маргелава.

Выходзячы з гэтага, Бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За непадзяўраньне большавіцкай самакрытыцы, права-апартуністычных антыпартыйных поглядаў (як абапяваўся Маргелаў), што бюро ГК расцэньвае як нежаданьне да канца выкрыць сваёй «гарачай патрэбнасьцю самаўсьвядомленьня». Там, дзе меншавікі прымалі ўдзел у паўстаньні, яны былі прымушаны да гэтага пад націскам мас і ажыцьвялі паўстаньне пры першым яго паражэньні.

Нельга больш яркі перадаць сутнасьць адносін меншавікоў да паўстаньня, як гэта зрабіў адзін з былых ідэолёгаў меншавізму Мартынаў на IV зьезьдзе партыі. Вось што ён казаў:

«Нас яшчэ папракаюць, што ў летнія дні (дні паўстаньня—А.) так вялікія меншавікі і бальшавікі дзейнічалі зусім адналінна. Гэта больш-менш так... Але розьніца паміж намі і бальшавікамі была тая, што мы ачылі нашу становішча тым, што немы заўсёды Frankfurter Zeitung прыкладаем стаўвіцтвам. Бальшавікі-ж яркае да канца становішча ўмкнуліся і ачылі яго нармальным».

Камэнтары непатрэбны.

І вось страх меншавікоў перапалохаць буржуазію выклікаў у іх такую тактыку, якая была на справе здрадай інтарэсам пралетарыяту.

Чым-жа быў Бунд і якая была яго фізіяномія ў 1905 годзе?

Бунд быў тэй-жа меншавіцкай партыяй, упрыгожанай у далатак махровым нацыяналізмам. Яшчэ да II зьезду партыі Ленін выкрываў дробна-буржуазны нацыяналістычны характар Бунду, «Бунд падтрымліваў эканамізм, садзейнічаў расколу..., прымаў пастановы, што эканамічная барацьба ёсьць лепшы сродак палітычнай агітацыі»,—пішна Ленін пра першыя крокі Бунду. На шляху адколу пралетараў яўрэйскіх ад пралетараў іншых нацый Бунд пайшоў цьвёрдымі крокамі.

Зараз-жа пасьля I зьезду партыі ЦО Бунду пісаў, што «агульна-расійская партыйная арганізацыя ня можа з посьпехам абараніць спэцыяльныя яўрэйскія інтарэсы». Хіба тут ня чуваць голасу разьюшанага гандляра, яўрэйскага шавініста, аб тым, што пе дачакаюцца яўрэі дабра ад «гоя».

Такім чынам, фармальны прыхільнік лёзунгу «Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся», Бунд на справе раскочваў рады пралетараў, арганізаваў частку яўрэйскіх рабочых, якая ішла за Бундам, на нацыянальнай аснове, а ня клясавай салідарнасьці з рабочымі іншых нацыянальнасьцяй.

Бунд патрабаваў ад РСДРП перабудовы ўсяе партыі па федэратыўных падставах і стварэньня яўрэйскай рабочай партыі, як адзінага прадстаўніка яўрэйскіх рабочых.

На тэй-жа нацыяналістычнай падставе Бунд будаваў прафсаюзы.

Вянцом нацыяналістычнай творчасьці Бунду зьявілася яго праграма на нацыянальным пытаньні — славутая культурна-нацыянальная аўтаномія. Сутнасьць гэтае праграмы заключалася ў тым, што асобы, якія жывуць на ўсім паасобных тэрыторыях у адным дзяржаве, арганізуюцца паводле прынцыпу належнасьці да тае ці іншае «нацыянальнае культуры» ў адзін міжклясавы нацыянальны саюз. Кожная нацыя складае юрыдычнае цэлае і мае права аказываць свае ўплыў, маё свой нацыянальны парлямант з нацыянальнымі міністрамі.

Яркую характарыстыку нацыяналістычнай сутнасьці праграмы дае Ленін у наступных словах: «Асновы, прынцыповы грэх гэтай праграмы той, што яна імкнецца ўвасабіць у жыцьці самы упрыгожаны і самы абсалютны, да канца даведзены нацыяналізм».

Зласьціца, павінна быць яснай роля, з якой Бунд ужайшоў у рэвалюцыю 1905 г. Усё-ж паслухаем, што нам кажа «Большая Советская Энциклопедия» аб ролі Бунду і яго ідэёвай пазыцыі ў 1905 годзе. У томе VIII на старонцы 112 тав. Рафэс піша аб Бундзе наступнае: «У гэты перыяд палітычная пазыцыя Бунду была найбольш блізкай да бальшавіцкай: байкот Булыгінскай думы, стаўка на ўзброенае паўстаньне і на блёк пралетарыяту з сялянствам». У сваім творы «Нарысы па гісторыі Бунду» Рафэс паўтарае гэту ацэнку ня раз. «Перыяд са студзеньскіх дзён 1905 году да верасьня 1906 г. зьяўляецца перыядам набліжэньня Бунду да бальшавіцкай лініі».

Такім чынам, па галоўных праблемах рэвалюцыі дробна-буржуазны нацыяналістычны Бунд ператварыўся ў цудадзейных руках Рафэса ў «без пяці хвілін» бальшавіцкую партыю. Што гэта, чорная магія індыйскага факіра? Не, гэта—**бундаўскі паклёп на бальшавіцкую партыю, гэта спроба з негодными сродкамі ідэалізаваць Бунд, замазаць дробна-буржуазную нацыяналістычную сутнасьць яго.** Людзі, падобныя да Рафэса, ніколі ня могуць зразумець, што бундаўскія рабочыя, калі яны прымалі ўдзел у рэвалюцыйных выступленьнях, дык гэта не вынікала з лініі Бунду,—яны ішлі **супроць** яго лініі, Бунд знаходзіўся пад націскам мас падобна таму, як меншавікі, паводле Мартынава, прымалі ўдзел у паўстаньні. Давядзем гэта на фактах.

Па ацэнцы Рафэса Бунд у пытаньні аб рухаючых сілах рэвалюцыі стаяў на пазыцыі «найбольш блізкай да бальшавікоў». А як было на справе?

Пра ацэнку бальшавікамі расійскай буржуазіі ў рэвалюцыі 1905 г. і пра адносіны да яе мы пісалі ўжо вышэй. Буржуазія контр-рэвалюцыйна, задачы партыі—выкрываць яе сапраўдны характар. Саюз з буржуазіяй ніякім чынам недапушчальны.

А «найбольш блізкая да бальшавікоў» пазыцыя Бунду?

У канцы 1904 году ЦО Бунду піша аб буржуазіі наступнае: «Жыцьцё ставіць і перад ліберальнай буржуазіяй і перад [illegible] пралетарыятам адны і тыя-ж задачы. Дзеля такіх задач с.-д. можа заключаць з лібераламі часовы саюз».

У момант найвышэйшага ўздыму рэвалюцыйнай хвалі ў сьнежні 1905 году ЦК Бунду дае арганізацыям наступную дырэктыву: «Калі-б «грамадзтва» (ліберальная буржуазія — А.) раз назаўсёды адмянулася ад рэвалюцыі, дык рэвалюцыя была-б куды цяжэй, бо стварыць буржуазную рэвалюцыю супроць волі пластоў буржуазнага грамадзтва, якія маюць уплыў,—гэта цяжкая задача, якая ня мае да сябе падобнай».

Па-нашаму гэта пазыцыя выразна **меншавіцкая.**

Паводле Рафэса гэта пазыцыя «найбольш блізкая да бальшавікоў».

Возьмем другое пытаньне, адносіны да Саветаў Рабочых Дэпутатаў.

Ленін ацаніў саветы, як органы паўстаньня, як зародкавыя органы ўлады. Адзін з вядзіцельных урокаў рэвалюцыі 1905 г. той, што рэвалюцыйная творчасьць пралетарыяту стварыла саветы, будучую форму новага тыпу пралетарскай дзяржавы. Так ацэньвалі бальшавікі саветы.

Як адносіўся «бальшавік» Бунд да саветаў? На нарадзе паўдзёных арганізацый Бунду ў лістападзе 1905 г. была прынята наступная рэзалюцыя:

«Выходзячы з таго, што як званыя Саветы Рабочых Дэпутатаў імкнуцца... узяць у свае рукі кіраўніцтва ўсёй палітычнай і эканамічнай барацьбой рабочае клясы, што... саветы імкнуцца ўплыў с.-д. партыі... (карала) катэгарычна выказваецца супроць таго, каб с.-д. партыі арганізоўвалі беспартыйныя рабочыя саветы».

«Найбольш блізкая да бальшавіцкай пазыцыі» пазыцыя Бунду **супроць** стварэньня саветаў.

А можа рэвалюцыйны вопыт саветаў 1905 году пераканаў Бунд у памылковасьці яго погляду на ролю саветаў, водкавай формы ўлады пралетарыяту? Паглядзім, што піша ідэолёг Бунду Мэдэм у чэрвені 1906 г. аб саветах 1905 году.

«Чым зьяўлялася кампанія Петербурскага Савету Рабочых Дэпутатаў аб увядзеньні ўсюды васьмігадзіннага рабочага дня? Гэта было, падома, заканадаўчае беспартыйнай арганізацыі, якая адбывала чыста стыхійны парыў... Зусім падарванае захапленьне акцыі пралетарыятам адным і тым-жа назавы. Гэта сымптомы даволі яркія. Яны гаворяць... аб тым, што іх цягнула ў бок поўнаарэхцкіх плыняй...»

Хіба ня тырчаць тут перад вамі асьліныя вушы меншавізму. Да сьмерці перапалоханы твар дробнага буржуа, які дрыжыць перад рэвалюцыйнай ініцыятывай мас і ў шалёным жаху енчыць: «ратуйце, анархія ідзе».

Калі «страшная навала» праходзіць, калі дробны буржуй супакоены бачыць паражэньне «анархізму», ён з палягчэньнем на сэрцы ўзьнімае рукі ўгару і дзякуе ўсявышняга і шепча: «Ясьць такія арганізацыі, якім карысна зьнікнуць, калі яны напісалі першую старонку сваёй гісторыі... Пецярбурскі Савет Рабочых Дэпутатаў меў на рэдкасьць шчасьце... памерці своячасова» (Мэдэм).

«Без пяці хвілін бальшавікі» Бунд вяселіцца, скача, што саветы мелі рэдкае шчасьце... памерці своячасова.

Хіба гэта не агідны паклёп на рэвалюцыю 1905 году, на бальшавіцкую партыю, калі на фоне гэтых спраў, на фоне сапраўдных адносін Бунду да рэвалюцыі 1905 году чалавек мае «адвагу» сказаць, што ў гэты перыяд Бунд быў найблізкі да бальшавізму?

Калі генэральная рэпэтыцыя 1905 году перарасла ў пераможную рэвалюцыю 1917 году, калі саветы, якія мелі «рэдкае шчасьце памерці», сталі дзяржавай пралетарскай дыктатуры, дзе быў Бунд?

Бунд «крычыць, што пераход улады да пралетарыяту ёсьць «вар'яцкае злачынства, якое робіць бальшавікі ў адносінах да расійскай рабочай клясы і міжнароднай сацыялістычнай рэвалюцыі».

І зразумела, што супроць «вар'яцкага злачынства» трэба рашуча змагацца. Бунд становіцца ў рады контр-рэвалюцыйнай супроць Кастрычніка. Вось некаторыя старонкі, якія ўпісаў Бунд у «слаўную» гісторыю свайго змаганьня супроць «вар'яцкага злачынства».

У Менску ў сьнежні 1917 году бундаўцы прабуюць арганізаваць агульную забастоўку супроць Савецкай улады. На Украіне прадстаўнікі Бунду—актыўныя ўдзельнікі пятлюраўскай рады. Бундаўскія арганізацыі прымаюць актыўны ўдзел у белагвардзейскіх паўстаньнях у Яраслаўлі. У Беларусі Бунд сустракае нямецкіх акупантаў, як вызваліцеляў ад «бальшавіцкага гвалту». У часе нямецкай акупацыі прадстаўнікі Бунду ўваходзяць у склад контр-рэвалюцыйнай беларускай рады.

Разьюшаны дробна-буржуазны нацыяналістычны Бунд 1905 году зьяўляецца контр-рэвалюцыйным у 1917 годзе. Зараз, калі II Інтэрнацыянал займае сваё пачэснае месца сацыял-фашыстаў у радах інтэрвэнтаў супроць краіны дыктатуры пралетарыяту, Бунд сумленна выконвае свае сацыял-фашыстскія абавязкі сярод тых яўрэйскіх рабочых, якія яшчэ ідуць за ім. Як выконвае гэта Бунд? Ён укараняе ў сьвядомасьць рабочых тую думку, што СССР ня ёсьць краіна пралетарыяту, якая пераможна будуе сацыялізм, а зьяўляецца такой самай імпэрыялістычнай краінай, як і іншыя вялікія імпэрыялістычныя дзяржавы. Калі сусьветны імпэрыялізм зваб'ю сваю разьведку на ўсходняя-кітайскай чыгунцы, Бунд пісаў у «Фолькс цайтунг»: «Паміж дагаворам (1924 г. з Кітаем) і старым царскім дагаворам няма ніякай прынцыповай розьніцы... Калі гэта не вялікі імпэрыялістычны байструк, дык гэта ўсё-ж імпэрыялістычны байстручок». У другім нумары Бунд піша: «Гісторыя паказвае нам цікавыя зьвязам з СССР супроць «другіх імпэрыялістычных дзяржаў». Зараз СССР разам з «другімі імпэрыялістычнымі краінамі» ідзе супроць Кітаю».

Дык вось адзіная краіна дыктатуры пралетарыяту прадстаўляецца Бундам, як драпежніцкая імпэрыялістычная дзяржава, якая павінна быць скінута. Пралетарыят СССР ужывае гэтаўчынныя намаганьні для пасьляховага будаўніцтва сацыялізму. Паводле-ж Бунду камуністы выконваюць вось якую задачу. «Для кожнага робіца ўсё больш яснай тая вялікая розьніца паміж тым, што камуністы гаворацьць і тым, што яны робяць... Яны хочуць паскорыць ход рэвалюцыі, а сваімі дзеямі яны ўзмацняюць контр-рэвалюцыйныя сілы».

Зласьціца, ясная роля Бунду, пачынаючы з 1905 году да апошніх дзён. 1905 год выкрыў да канца сутнасьць і ролю кожнае клясы і партыі ў Расіі. Роля і сутнасьць Бунду выкрыты 1905 годам цалкам і поўнасьцю. Нацыяналістычная дробна-буржуазная контр-рэвалюцыйная сутнасьць Бунду разгортваецца на меры разгортваньня холу пралетарскай рэвалюцыі і набывае сацыял-фашыстскі характар разам з усім II Інтэрнацыялам, удзельнікам інтэрвэнцыі супроць СССР.

Так выглядае лягэнда-паклёп аб бальшавіцкай блізкасьці Бунду да бальшавізму.

Паклёпу трэба нанесьці рупнуючы, сьмяротны ўдар.

Паартарганізацыі змогуць толькі пры ўмове бязьлітаснай барацьбы супроць правых і „левых" апартуністаў у тэорыі і на практыцы

Усе сілы—на разгортваньне калгаснага руху

ПЕРАКЛЮЧЫЦЦА НА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Дырэктывы партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ўсіх зьвязаных з гэтым мерапрыемстваў не знайшлі належнага месца ў рабоце **Кармянскай** раённай партарганізацыі. Апартуністычная практыка ў радзе парт'ячэек, слабое кіраўніцтва з боку райкому іх работай зьяўляецца асноўнай прычынай прарываў у рабоце па калектывізацыі і выкананьні важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Рад ячэек гэтай арганізацыі не стаіць на чале калгаснага руху бядняцка-сераднякоў мас. Калектывізацыя каля 20% зямельнай плошчы ў раёне праходзіла стыхійна, самацёкам. Наколькі слаба ажыцьяўляецца партыкіраўніцтва калектывізацыяй, узмацненьнем гаспадарчага стану існуючых калгасаў у раёне, відаць з таго, што амаль ні ў адным калгасе ня ўведзена тарыфікацыя і зьдельшчына. Працыцыпліна вусім на нізкім узроўні. Частка калгаснікаў за ўвесь летні перыяд мае толькі па 25-30 **рабочых дзён.** Барацьба з парушэньнем працоўнай дысцыпліны вялася **выключна голымі адміністрацыйнымі мерамі,** прычым, як мэтад барацьбы за ўзмацненьне працдысцыпліны, у радзе калгасаў ужываліся штрафы, што зьяўляецца недапушчальным.

Да пытаньня разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце калгасаў большасьць парт'ячэек падыходзіла фармальна. У гэтай справе нічога, апрача прыняцьця пастановы на агульных сходах калгаснікаў няма. Выторчыя нарады ў калгасах не арганізаваны.

У выніку—плян асеньняй сяўбы калгасамі недавыкаран на 13 проц., па індывідуальным сэктары вусім няма ніякага ўліку.

Заблёва сарвана: калгасным сэктарам плян выкаран толькі на 25 проц. і індывідуальным—на 20 проц.

Зварачае на сябе ўвагу і існуючая безгаспадарчасьць у радзе калгасаў. Будаўніцтва абор і сьвінарнікаў у большасьці калгасаў сарвана. Абагуленая жывёла да гэтага часу знаходзіцца пад адкрытым небам. Праўленьне калгасу **«Новы сьвет»** раздало абагуленую былую кулацкую жывёлу ў індывідуальнае карыстаньне калгаснікаў. Калгасам «Праўда» раздаваліся парасяты сялянам - адзіноасобнікам за канцэнцыю бульбы. На гэтыя недапушчальныя зьявішчы мясцовыя арганізацыі не рэагуюць. **РВК і Райкалгасаюз ніякай увагі не зварачаюць на развіцьцё жывёлагадоўлі.**

Многія ячэйкі не зварачаюць належнай увагі на гаспадарчае ўзмацненьне існуючых калгасаў, некаторыя з іх не зьяўляюцца арганізуючай сілай новага калгаснага руху. Пасобныя калгасы штучна затрымліваюць свой рост за лік іншых гаспадарак. Напрыклад, праўленьне калгасу **«Праўда» адмовілася прыняць у калгас батракоў і беднякоў** па матывах іх беднасьці. Засмечанае кулацкімі элементамі праўленьне калгасу «Праца» стварыла такія ўмовы для беднякоў, што ячэйка добра ведала аб тым, з якімі труднасьцямі т. Маргелаў пад націскам крытыкі на нарадзе ў «Зьвязьдзе» ішоў на прызнаньне і асуджэньне сваёй праваапартуністычнай сыстэмы поглядаў.

Ніжэй мы даем рэзалюцыю Фрунзаўскага райкому партыі, якая падводзіць вынікі барацьбы, пачатай «Зьвяздой» за выкрыцьцё і вымярыцьцё антыпартыйнай сыстэмы поглядаў т. Маргелава.

Аб памылках у працах таварыша Маргелава (ячэйкі БНДІ)

Рэзалюцыя бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Пасьляховае сацыялістычнае будаўніцтва, рашучае наступленьне на капіталістычныя элементы гораду і вёскі па ўсім фронце, ліквідацыя кулацтва як класу на базе суцэльнай калектывізацыі—выклікае шаленую нянавісьць і супраціўленьне клясавых ворагаў.

Абостраная клясавая барацьба разгортваецца і выяўляецца ня толькі ў падрыве нашага гаспадарчага будаўніцтва, рабочага забесьпячэньня, у стварэньні контр-рэвалюцыйных арганізацый для правядзеньня шкодніцкай работы і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі сумесна з капіталістычнымі дзяржавамі і іх генэральнымі штабамі—супроць СССР, але ў ня меншай меры і вострасьцю адбываецца клясавая барацьба на навукова-культурным фронце.

Шкодная праца на навуковым фронце газгортваецца на лініі затрыманьня падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў, па лініі абароны, падтрыманьня і прапагандаваньня варожых марксызму тэорыя. У сваёй працы буржуазныя вучоныя ставілі стаўку на разьвіцьцё нашай гаспадаркі на капіталістычным шляху, складалі і абаранялі ў адзіноасобіцы з гэтым тэорыю трэцяга разьвіцьця, абгрунтоўвалі і распаўсюджвалі сваёму ўплыву рад месцаў устойлівых камуністаў.

Тав. МАРГЕЛАЎ, працуючы ў БНДІ пад кіраўніцтвам пацдэма Г. ГАРЭЦКА-ГА, ня толькі ня вёў рашучай барацьбы ў тэорыі і практычнай дзейнасьці з контр-рэвалюцыйным нац.-дэмакратызмам; але сам цалкам падпаў пад яго ўплыў і пераходзіў у сваіх навуковых працах буржуазным, антымарксыцкім, анты-ленінскім поглядам, абараняючы і прапагандаючы рэакцыйны тэорыі буржуазных эканамістаў (Вэбэр) па эканоміку нераходнага перыяду.

(«Да пытаньняў аб штандардзе». «Праблема ўраджайнасьці», «Да пытаньня аб штандарце баконных заводаў...» і т. д.).

У папулярнай брашуры «Калгас—адзіны шлях сялянства», выд. у 1930 г. і прызначанай для калгаснікаў і бядняцка-сераднякоў мас сялянства, т. Маргелаў ня толькі ня выправіў сваіх мінулых памылак, але даваў новыя (тэорыя трох шляхоў разьвіцьця сялянскай гаспадаркі: «капіталістычны, сацыялістычны, асобны») і ўпна стаў на пункт погляду правага ўхілу ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва.

Тав. Маргелаў у папулярнай брашуры за апошні месяц «Супроць беларускай кандрацьцеўшчыны» па цэлым радзе пытаньняў праводзіць нацыянал-апартуністычную лінію ў сваёй працы, вяруючы пад абарону контр-рэвалюцыйных нац.-дэмакратаў (Смоліч, Гарэцкі і інш.).

Рэвалюцыя 1905 году мела вялізарнейшае значэньне як для далейшага разьвіцьця рэвалюцыі ў Расіі, так і для ходу міжнароднай рэвалюцыі.

Ленін ня раз падкрэсьліваў, што «без генэральнай рэпэтыцыі 1905 году перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 году была-б немагчымая».

Адзін з выдатнейшых урокаў рэвалюцыі 1905 году заключаецца ў тым, што былі поўнасьцю выкрыты сутнасьць і роля розных клас і партый, якія дзейнічалі на прадзіну рэвалюцыі. Вопыт рэвалюцыі непаўторна давёў, што адзіная партыя пралетарыяту, якая здольна была вырашыць праблемы, якія ставілі перад рэвалюцыяй, гэта была бальшавіцкая партыя з яе генэральным праводыром Леніным.

Бальшавікі разгарнулі наступны стратэгічны плян.

Рэвалюцыя ў Расіі зьяўляецца на першым этапе буржуазна-дэмакратычнай, яна не адрозьніцца кітайскай сьвяной ад пераростае ў яе.

Галоўнай рухаючай сілай рэвалюцыі, яе гегемонам зьяўляецца пралетарыят, які ў саюзе з сялянствам адзін здолен завяршыць пераможную рэвалюцыю.

Буржуазія набіраецца некаторых уступак ад самаўладзьдзя, але баіцца зьвяржэньня яго, як вернай апоры супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту. Зьдзелка з царызмам, але не зьвяржэньне—вось праграма буржуазіі. Правяліцца была ацэнка бальшавікамі роля нацыянальнага пытаньня ў рэвалюцыі і дай адказ на гэта пытаньне ў пункце праграмы аб праве нацыя на самавызначэньне, г. зн. права на аддзяленьне.

З бальшавіцкага стратэгічнага пляну вынікала бальшавіцкая тактыка. Вызначэньне, перш за ўсё, пралетарыяту, як аусім асобнай класы, ад іншых працоўных і прыгнечаных мас. Раней вылучыцца для того, каб кіраваць, каб быць гегемонам. Пралетарыят мае свае рэвалюцыйную партыю, якая вызначэна ня толькі з памерамі і буржуазіяй, але і з іх арганізацыі ў рабочай клясе—меншавікамі. Формы змаганьня—дамаганьні, усеагульная забастоўка і, галоўнае, узброенае паўстаньне, якое скідае самаўладзтва і ажыцьцяўляе рэвалюцыйна-дэмакратычную дыктатуру пралетарыяту і сялянства.

При вырашэньні «мінулага» дыктатуры пралетарыяту і сялянства пралетарыят з бядняцкім сялянствам пераходзіць зараз-жа, да вяшчыцьцяўленьня «будучага» дыктатуры, да пралетарскай

Аб задачах камуністаў навуковых працаўнікоў і ўцягненьні іх у агульную партыйную работу

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б канстатуе вялікае адставаньне тэарэтычнай работы ад чарговых палітычных і гаспадарчых задач, якія стаяць перад партарганізацыяй. Камуністы—навуковыя працаўнікі і карксыцкія т-вы не вялі рашучай барацьбы з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, не разгарнулі своячасова крытыкі нацыянал-дэмакратычных канцэпцый у галіне навукі, што тлумачыцца недастатковай бальшавіцкай пільнасьцю і прымірэнчымі адносінамі да нацыянал-дэмакратызму з боку часткі навуковых працаўнікоў, пазбаўленасьцю сярод камуністаў—навуковых працаўнікоў—асобных нацыянал-апартуністаў (Ігнатоўскі, Жылуновіч), а таксама недастатковым разгортваньнем самакрытыкі сярод навуковых працаўнікоў і адарванасьцю навуковае работы ад пралетарскае грамадзкасьці.

Навуковая праца камуністаў навуковых працаўнікоў вялася і вядзецца надзвычай слабымі тэмпамі без плану і ўвязкі з канкрэтнай работай партыі. Марксыцкія навуковыя т-вы, якія павінны былі арганізаваць і фарсаваць навуковую работу камуністаў і весьці барацьбу з усімі антымарксыцкімі тэорыямі, працуюць надзвычайна слаба або зусім не працуюць (ОВМД, т-ва эканамістаў, педагогаў і інш.).

Навуковыя працаўнікі камуністы ня прымаюць патрэбнага ўдзелу ў распрацоўцы пытаньняў, якія стаяць перад партыяй, а таксама ў практычнай работе і ў прыватнасьці зусім невыстарчальны ўдзел прымаюць **у партыйнай** прэсе.

Выходзячы з агульных задач, якія стаяць перад партыяй на ідэалёгічным фронце, ЦК высоўвае наступныя мерапрыемствы, якія павінны быць праведзены ў бліжэйшы час і на выкананьні якіх павінна быць сканцэнтравана ўвага і работа марксыцка-ленінскіх т-ваў і ўсіх навуковых працаўнікоў камуністаў:

1. Прапанаваць Культпропу ЦК і фракцыям навуковых т-ваў ажывіць работу марксыцкіх т-ваў, дабіўшыся таго, каб яны сталі сапраўднымі арганізатарамі плянавай і калектыўнай навуковай работы марксызму, ліквідаваць маючы месца паралелізм у рабоце марксыцкіх т-ваў і розных навуковых установ. Марксыцкім т-вам увязаць сваю работу з работай адпаведнай навуковай установы (ОВМД, катэдра марксызму-ленінізму БАН, т-ва аграрнікаў НДІ, т-ва педагогаў, педагагічны інстытут і г. д.). Марксыцкім т-вам прыняць актыўны ўдзел у рабоце гэтых устаноў, канцэнтруючы работу т-ваў і ўстаноў на агульных задачах, адначасова устанаўліваючы дасканальнае размежаваньне працы паміж т-вамі і навуковымі установамі.

Сакратарыят прапануе Культпропу тэрмінова распрацаваць і паставіць на Сакратарыят пытаньне аб канцэнтрацыі і плянаваньні навуковай працы.

У мэтах каардынацыі работы марксыцкіх навуковых т-ваў, арганізацыі сумесных выступленьняў, сумеснага выданьня навуковых работ («Марксыцкага зборніка»), узаемнай дапамогі ў рабоце і т. д., — ЦК лічыць мэтазгодным стварэньне асацыяцыі марксыцкіх навуковых т-ваў.

2. ЦК высоўвае, як першачарговую задачу, якая стаіць перад навуковымі працаўнікамі камуністамі, прапрацоўку наступных пытаньняў:

а) Крытычную распрацоўку ўсёй навуковай традыцыі, вынутчанай да гэтага часу ў Беларусі ў мэтах выкрыцьця буржуазных тэорый, вялікадзяржаўных і нацыянал-дэмакратычных поглядаў, якія праводзіліся пад маскай навуковых досьледаў. Вынікі гэтай працы шырока асьвятліць у радзе артыкулаў у газэтах і часопісах і масавых дакладах. Лічыць неабходным выпуск кнігі «Навука на службе ў нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыі».

Кніга павінна быць здана ў друк пазьней 15-II 31 г. Культпропу ЦК КП(б)Б распрацаваць плян кнігі, вызначыць таварыша, адказных за своячасовую падрыхтоўку кнігі, максымальна разгрузіўшы іх ад іншай працы.

б) Паскорыць выпуск кнігі па гісторыі Беларусі, у якой было-б дана марксыцкае асьвятленьне асноўных праблем Беларуск

Генэральны агляд прамысловасьці

РАСЬЦЕ ШАРЭНГА БАЙЦОЎ ЗА ПЯРШЫНСТВА

Датэрміновае выкананьне вытворчых праграм---грамавы ўдар па правых і „левых“ апартуністах

СУСТРЭЧНЫ---КЛЮЧ ДА ПЕРАМОГІ

ПАВЯЛІЧЭНЬНЕМ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ПРАЛЕТАРЫІ БССР НА СПРАВЕ ДАВОДЗЯЦЬ СВАЮ АДДАНАСЬЦЬ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, СВАЮ НЕПАХІСНУЮ ВОЛЮ ВЫКАНАЦЬ ПЯЦІГОДКУ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Посьпех

забясьпечаны добрай прапрацоўкай

За апошнія месяцы заводзкія арганізацыі «Энэргіі» карэнным чынам зьмянілі формы і мэтады партыйнай і прафсыянальнай работы. Кіраўнікі заводу пачалі ўдумліва адносіцца да кожнага мерапрыемства і складаць канкрэтныя пляны ўцягненьня рабочых мас у прапрацоўку кожнага пытаньня.

Мэтады, ужытыя для прапрацоўкі кантрольных лічбаў і складаньня сустрэчнага прамфінпляну, далі вельмі добрыя вынікі.

Кантрольныя лічбы былі разгледжаны на пасяджэньні бюро парткалектыву. Потым бюро парткалектыву разам з заўкомам прапанавалі адміністрацыі скласьці лічбы для кожнага цэху, варштату і для кожнага рабочага. Калі гэта было зроблена, пытаньне было пастаўлена на тэхнічнай нарадзе: гутарка ішла аб мэтадах прапрацоўкі кантрольных лічбаў у цэхах.

Усе адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі мабілізаваліся на прапрацоўку кантрольных лічбаў. Лічбы абгаварваліся на пасяджэньнях цэхнарт'ячэек, цэхпраф мітынгаў. Былі вызначаны выразныя ўстаноўкі. Паралельна, кантрольныя лічбы былі перададзены для прапрацоўкі ўдарным брыгадам. Кожная брыгада абмеркавала свой прамфінплян на 1931 год, пры чым кожная брыгада падыходзила да гэтага пытаньня з пункту погляду мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. У выніку было сабрана 63 каштоўныя прапановы. Значная частка прапаноў была выканана ў працэсе прапрацоўкі. Засталося толькі 12 прапаноў, якія будуць выкананы ў бліжэйшы час.

Пачалі прапрацоўку кантрольных лічбаў 28-га кастрычніка (да рэчы, раней усіх заводаў Менску) і ўжо 29 лістапада на агульна-заводзкай канфэрэнцыі былі падагулены вынікі сустрэчнага

Сустрэчны павялічыў прамфінплян ударнага кварталу на 5 проц. Параўнальна-ж з кантрольнымі лічбамі абъяднаньня на 1930-31 год, якія былі даны ў верасьні, **сустрэчны прамфінплян 1931 году павялічыўся больш, як на 37 проц.**

Агульна-заводзкія выдаткі на 1931 г. зьменшаны сустрэчным прамфінпляном на 4 проц. **Заданьне аб зьніжэньні сабекошту павялічана рабочымі на 8 проц. і г. д.**

Д. М.

Як ня трэба

складаць сустрэчны

На заводзе «Ударнік» працуе 386 чалавек. Удзел у разглядзе прамфінпляну прыняло 80 проц. рабочых. Папярэдня кантрольныя лічбы былі абмеркаваны на пасяджэньні бюро парткалектыву, на жмір прысутнічалі партактыў, камсамольцы, прафактыў і майстры цэхаў. Тут кантрольныя лічбы былі ўзяты пад агонь крытыкі і бюро капектыву **высунула (!) наступныя лічбы:** кантрольныя лічбы прадугледжвалі праграму на суму 3.408.836 руб. Гэта лічба павялічана **да 638.500 руб., г. зн. на 18 проц.** Заданьне па зьніжэньні сабекошту павялічана замест 10,2 проц. да 11 проц. Прадукцыйнасьць працы ўзьнята да 25 проц. замест 23 проц.

Пасьля абгаварэньня на бюро парткалектыву лічбы абгаварваліся на пасяджэньні заўкому, а пасьля гэтага пайшлі ў нізы—на цэхавыя партсходы, рабочыя сходы, брыгады.

Бюро рацыяналізацыі, разам з актывам заводу, таксама разглядала кантрольныя лічбы і сустрэчны і абгаварвала, якія чынам зьніжэньні недахопы: пляўзвязку ў рабоце паміж цэхамі, праспусьціла яго «ў нізы» для абмеркаваньня і... ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЯ. Такі мэтад прапрацоўкі кантрольных лічбаў і складаньня сустрэчнага прамфінпляну гаворыць аб тым, што партКіраўніцтва заводу НЕ ЗРАЗУМЕЛА ПРЫНЦЫПАЎ СКЛАДАНЬНЯ СУСТРЭЧНЫХ ПРАМФІНПЛЯНАЎ.

Пачынаньне

віцебскіх закройшчыкаў

ЗАКРОЙШЧЫКІ І МАРКЯРОЎШЧЫКІ НОВАЙ І СТАРАЙ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫК У ВІЦЕБСКУ АБМЕРКАВАЛІ ЛІЧБЫ ВЫТВОРЧАЙ ПРАГРАМЫ І НОРМЫ ВЫДАТКАВАНЬНЯ МАТАР'ЯЛУ НА 1931 Г. УЗВАЖЫЎШЫ ЎСЕ АСАБЛІВАСЬЦІ НОВЫХ ЛЕКАЛАЎ ПА ЗАЦЬВЕРДЖАНЫХ БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНІ МАДЭЛЯХ, ЯНЫ ПРЫШЛІ ДА ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ, ШТО ПРЫ ЖАДАНЬНІ І ЎВАЖЛІВЫХ АДНОСІНАХ ДА РАБОТЫ, ЛЯБАРАТОРЫЯ МОЖА ВЫСУНУЦЬ НАСТУПНЫЯ СУСТРЭЧНЫЯ ЛІЧБЫ ЭКАНОМНАГА ВЫДАТКАВАНЬНЯ МАТАР'ЯЛАЎ: НА ГАРНІТУР-ДВОЙКУ ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 2,50 САНТ. ЭКАНОМІІ — 2,45 САНТ., ШТО ПРЫ ВЫПУСКУ 820.000 АДЗІНАК, СКЛАДАЕ ЭКАНОМІЮ 41.000 МЭТРАЎ МАТАР'ЯЛУ НА СУМУ 200.000 РУБ. У ГОД. ЭКАНОМІЯ НА АДНЫМ ПАЛІТО ВЫЗНАЧАНА Ў ДВА САНТЫМЭТРЫ, ШТО ПРЫ ВЫПУСКУ 629.878 АДЗІНАК СКЛАДАЕ ЭКАНОМІЮ Ў 10.600 МЭТРАЎ МАТАР'ЯЛУ НА СУМУ 50.000 РУБ. ЭКАНОМІЯ НА ВЫПУСКУ МАЙТАК У РАЗЬМЕРЫ 1 САНТ. ПРЫ ВЫПУСКУ 1.300.000 ПАР У ГОД, СКЛАДАЕ ЭКАНОМІЮ 10.000 МЭТРАЎ НА СУМУ 44.000 РУБ.

ТАКІМ ЧЫНАМ, ПРАПАНОВЫ ЗАКРОЙШЧЫКАЎ ВІЦЕБСКІХ ШВЭЙНЫХ ФАБРЫК ПРЫНЯСУЦЬ ЭКАНОМІЮ 61.600 МЭТРАЎ МАТАР'ЯЛУ НА СУМУ 294.000 РУБ.

РЭАЛЬНАЕ АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ, ВЫСУНУТАГА РАБОТНІКАМІ ЛЯБАРАТОРЫІ, ПАТРАБУЕ МАКСЫМАЛЬНАЯ УВАГІ Ў РАБОЦЕ. АДМІНІСТРАЦЫІ-Ж ТРЭБА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ НАРМАЛЬНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ РАБОТЫ ЛЯБАРАТОРЫІ. ТАДЫ МОЖНА З УПЭЎНЕНАСЬЦЮ СКАЗАЦЬ, ШТО СУСТРЭЧНЫ БУДЗЕ ВЫКАНАК

Ш. К.

Рацыяналізацыя---

аснова сустрэчнага

Рабочыя бабруйскай швэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага ўжо абгаварылі кантрольныя лічбы на 1931 год і высунулі свой сустрэчны прамфінплян.

Сустрэчны прамфінплян дзяржынцаў вызначае ўдарныя мэтады работы. План выпуску прадукцыі, прапанаваны адміністрацыяй, павялічаны рабочымі ў сярэднім на 5-6 проц.

Прамфінплян на 1931 год прадугледжвае зьніжэньне сабекошту на 9,93 проц., а рабочыя ў сваім сустрэчным пайшлі яшчэ далей, абавязаўшыся зьнізіць сабекошт на 10,07 проц.

Сустрэчны таксама прадугледжвае скарачэньне выдаткаваньня сырцу на адзінку прадукцыі, скарачэньне працэсаў апэрацыі і г. д.

На 1931 год па фабрыцы вызначан рад рацыянапізатарскіх мерапрыемстваў. Па вырабу майтак кольнасьць апэрацый скарачаецца з 52 да 43, па дзіцячым паліто — з 20 да 13, па прагумленых паліто — з 44 да 33.

Зараз ідзе падрыхтоўка да лепшай перабудовы работы. Вызначан пераход на аплату, выходзячы з апошняй, апэрацыі, што павялічыць зацікаўленасьць рабочых сваёй працай і палепшыць якасьць прадукцыі.

Абсталёўваюцца пад'ёмнікі для падачы сырцу ў цэх і дастаўкі гатовай прадукцыі. Мяркуецца ўвесьці сыгналізацыю для выкліку мэханікаў. Швэйныя машыны будуць удасканалены спэцыяльнымі лапкамі для аховы пальцаў ад праколаў. Будзе праведзен і рад іншых мерапрыемстваў: інструкцыйныя карткі па кожнай апэрацыі, спрашчэньне ўліку прадукцыі, мэханічная падача апалу і г. д.

У 1931 годзе фабрыка будзе працаваць бесьперапынна круглы год, ня спыняючы работы цэхаў у часе адпускной кампаніі.

А. МАГІДАЎ.

Камсамольская брыгада фабрыкі «Камунарка», павысіўшая нормы выпрацоўкі ў дні вытворчых манэўраў на 250 проц.

Лепшая ўдарніца акулярнай ф-кі т. ХМЯЛЕЎСКАЯ

Пралетарцы абавязуюцца

ПРАПРАЦОЎКА КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ 1931 ГОДУ НА ТУДЕ «ПРАЛЕТАРЫ» ВЫКЛІКАЛА ВЯЛІКУЮ АКТЫЎНАСЬЦЬ З БОКУ ЎСІХ РАБОЧЫХ, АСАБЛІВА ЎДАРНІКАЎ, ШТО ДАЛО МАГЧЫМАСЬЦЬ СКЛАСЬЦІ СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН, ЯКІ ЗНАЧНА ПЕРАВЫШНАЕ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ.

ПАСЬЛЯ ПРАПРАЦОЎКІ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ НА ПАСЯДЖЭНЬНІ БЮРО ЯЧЭЙКІ КП(б)Б, ЗАЎКОМУ І АДКРЫТЫМ ПАРТСХОДЗЕ, БЫЛІ АБРАНЫ ЧАТЫРЫ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ Ў ЛІКУ 20 ЧАЛ., ЯКІЯ РАЗАМ З АКТЫВАМ ДОБРААХВОТНІКАЎ ПРАПРАЦАВАЛІ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ **ПА ГРУПАХ.** УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ПОТЫМ ЗРАБІЛІ СПРАВАЗДАЧЫ АБ СВАЁЙ РАБОЦЕ ПА ЗЬМЕНАХ І ЦЭХАХ. УСЕ МАТАР'ЯЛЫ БРЫГАД БЫЛІ ПЕРАДАНЫ ЧАСОВАЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ, ЯКАЯ ТАКСАМА АБМЕРКАВАЛА ГЭТЫЯ МАТАР'ЯЛЫ, **УВЯЗАЎШЫ ІХ З РАБОЧЫМІ ПРАПАНОВАМІ.** І АПОШНІ ПРАЦЭС ПРАПРАЦОЎКІ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ — АБМЕРКАВАНЬНЕ І ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНЕ СУСТРЭЧНАГА АГУЛЬНЫМ СХОДАМ.

ВОСЬ ТАКІ МЭТАД ПРАПРАЦОЎКІ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ДАЎ МАГЧЫМАСЬЦЬ САПРАЎДЫ СКЛАСЬЦІ СУСТРЭЧНЫ ПА ПАДСТАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСІХ РЭСУРСАЎ КОЖНЫМ ВАРШТАТАМ І РАБОЧЫМ.

У ВЫНІКУ КАНТРОЛЬНАЯ ЛІЧБА ПА ВЫПРАЦОЎЦЫ ПАЎЛІТРОВЫХ БУТЭЛЯК У 1.178 ШТ. ПАВЯЛІЧАНА ДА 1.200, ЗАДАНЬНЕ ПА ВЫРАБУ БУТЭЛЯК ДЛЯ СІТРО ПАВЯЛІЧАНА З 1.040 ДА 1.100 БУТЭЛЯК ДЛЯ ВОЦТУ—З 1.500—ДА 1.700 І Т. Д.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ПРЫ ЗАЦЬВЯРДЖЭНЬНІ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ ВЫСТУПІЛА ШМАТ ЎДАРНІКАЎ, ЯКІЯ ЗАЯЎЛЯЛІ ПРО ТЫМ, ШТО ПРЫМУЦЬ ЎСЕ МЕРЫ, КАБ ВЫКАНАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ЎЗЯТЫЯ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НА 1931 ГОД.

А. ФАМЛЮК.

Забясьпечыць прамысловасьць работнікі сілай

СНК БССР даручыў ВСНГ, НКЗямляробства і НКГандлю ў двухдэкадны тэрмін дэталёва высьветліць лішкі рабочай сілы ў пасёлках абъяднаньнях і трэстах для перакіду апошняй у тыя галіны прамысловасьці, дзе ў ёй адчуваецца недахват.

СНК абавязаў усе наркаматы і ўстановы, якім патрэбна рабочая сіла, свае часова прадстаўляць Наркампрацы адведзены матар'ял.

РАЎНЕНЬНЕ НА ПЕРАДАВІКОЎ!

„ПРАЛЕТАРЫ“, „КАСТРЫЧНІК“, „РАБОЧИЙ“, „КАМУНАРКА“, ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ, ЛІЦЕЙНЫ ЦЭХ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, 1-ШЫ ХРОМАВЫ І ЖЭЛЯТЫННЫ ЦЭХІ „БАЛЬШАВІКА“ ЎПІСАЛІ СВАЁ ІМЯ Ў ГАНАРОВЫ ЧЫРВОНЫ СЬПІС ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ

„Пралетары“ перавыканаў сустрэчны

ГОМЕЛЬ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 25 СЬНЕЖНЯ ЗАВОД «ПРАЛЕТАРЫ» СКОНЧЫЎ ПРАГРАМУ АСОБАГА КВАРТАЛУ, ВЫКАНАЎШЫ ПЛЯН НА ЎСЕ 100 ПРОЦ.

НА ПРАЦЯГУ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ АБВЕШЧАНАЙ НА ЗАВОДЗЕ ДЗЕСЯЦІДНЕЎКІ ПРАВЕРКІ ВЫКАНАНА 118 ПРОЦ. СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ 1931 ГОДУ.

ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА.
БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ.
ЗАУКОМ.

Ударная брыгада мэханічнага цэху, віцебскай акулярнай ф-кі

Ударнікі трэцяга году

Хромавы і жэлятынны цэхі гарбарні „Бальшавік“ датэрмінова выканалі прамфін лян

22 СЬНЕЖНЯ **ПЕРШЫ ХРОМАВЫ ЦЭХ** ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА ЗАВОДУ «БАЛЬШАВІК» ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЎ ПРАМФІНПЛЯН ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ Ў РАЗЬМЕРЫ **100,57 ПРОЦ.**

25 СЬНЕЖНЯ **ЖЭЛЯТЫННЫ ЦЭХ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЎ СУСТРЭЧНЫ ПРАМФІНПЛЯН ЗА ЎДАРНЫ КВАРТАЛ У РАЗЬМЕРЫ 100,02 ПРОЦ.**

ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ НА СПРАВЕ ПАЦЬВЯРДЖАЕ РЭАЛЬНАСЬЦЬ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ, УЗЯТЫХ НАШАЙ ПАРТЫЯЙ І РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ І АБВЯРГАЕ ЎСЕ АПАРТУІСТЫЧНЫЯ ТЭОРЫІ ПРАВЫХ І «ЛЕВЫХ» УХІЛІСТАЎ.

НА ПАДСТАВЕ АТРЫМАНЫХ ПЕРАМОГ, РАБОЧЫЯ ЖЭЛЯТЫННАГА ЦЭХУ АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАЛЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Энтусіязм рабочых перамог

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). 26-га сьнежня, а 12 гадз. ночы **фабрыка «Рабочы»** датэрмінова выканала прамфінплян асобнага кварталу. Фабрыкай выпушчана 184.940 пар калодак.

Прадукцыйнасьць працы павялічылася на 10 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжаны на 16 проц. замест 15 проц., вызначаных плянам.

На мітынгу, прысьвечаным скончэньню вытворчай праграмы, рабочыя высунулі сустрэчны прамфінплян на наступны квартал трэцяга году, які перавышае праграму асобнага кварталу на 28 проц.

Рабочыя абавязаліся перавыканаць сустрэчны.

Давялі рэальнасьць прамфінпляну

ГОМЕЛЬ. (Па тэлеграфу). Ліцейны цэх **заводу імя Ланцуцкага** на справе давёў рэальнасьць прамфінпляну асобнага кварталу.

26-га сьнежня цэх **скончыў прамфінплян ударнага кварталу з перавышэньнем.** Так, замест 300 растворамяшалак адліта ліцьця на 450, замест 21 кампядрабілкі адліта ліцьця на 25. Замест ліцьця для 60 вагонаў адліта на 64.

За апошні квартал 1929-30 году цэхам адліта 404 тоны, а ў асобным ударным квартале адліта 600 тон. Пр[illegible]цыйнасьць працы на кожнага чалавека ўзьнялася на 28 проц.

Ліцейны павінен быць прыкладам для іншых цэхаў заводу, якія адстаюць.

Змагаюцца за пераходны сьцяг

ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАЯ ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА **«КАСТРЫЧНІК»** ПАЧАЛА АСОБНЫ КВАРТАЛ ЎДАРНЫМІ ТЭМПАМІ РАБОТЫ. ПРАВЕДЗЕНЫЯ НА ФАБРЫЦЫ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ ЎЗЬНЯЛІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ, ДАЛІ НОВЫЯ БРЫГАДЫ ЭНТУЗІЯСТАЎ.

ЯК ШКОЛІ, У ГЭТЫМ КВАРТАЛЕ ФАБРЫКА МЕЛА ПРЫЦЭК РАБОЧЫХ ПРАПАНОЎ, ЯКІЯ МОЦНА БІЛІ ПА ЎСІХ ВЫТВОРЧЫХ НЕПАЛАДКАХ НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ.

ПАМІЖ ЦЭХАМІ РАЗГАРНУЛАСЯ СПАБОРНІЦТВА ЗА ПЕРАХОДНЫ СЬЦЯГ.

У ВЫНІКУ ВЫСОКАЙ НАЛІТЫЧНАЙ СЬВЯДОМАСЬЦІ РАБОЧЫХ І ПРАЯЎЛЕНАГА ІМІ ПРАЦОЎНАГА ЭНТУЗІЯЗМУ, **ФАБРЫКА 26 СЬНЕЖНЯ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯН ЎДАРНАГА КВАРТАЛУ Ў РАЗЬМЕРЫ 104 ПРОЦ.**

ДЫРЭКТАР ФАБРЫКІ
КАЛАБКОЎ.
САКРАТАР ПАРТКАЛЕКТЫВУ
РОХКІНД.
СТАРШЫНЯ ФАБКОМУ
КАГАН.

Вызваліліся

АД ЗАМЕЖНАЙ ЗАЛЕЖНАСЬЦІ

11.000 руб. эканоміі дала рацыяналізацыя на акулярнай ф-цы

Віцебская акулярная фабрыка адзіная ў СССР, якая выпрацоўвае аптычныя і ахоўваючыя прылады для ўсёй прамысловасьці. Толькі год таму назад фабрыка прадстаўляла сабой поўсматужную майстэрню, у якой працавала каля 300 рабочых. Зараз на фабрыцы працуюць ужо 1.400 чалавек, пабудаваны новыя карпусы, фабрыка абсталявана навейшымі машынамі. Ва ўдарным квартале фабрыка **выпускае на 1 млн. руб. прадукцыі.**

Другі год пяцігодкі фабрыка скончыла з перавыкананьнем праграмы на 1,5 проц. Кантрольныя лічбы на ўдарны квартал прадугледжвалі вялікі рост вытворчасьці. Рабочыя высунулі сустрэчны прамфінплян, які на 10 проц. перавышаў кантрольныя лічбы.

Ва ўдарным квартале фабрыка пачала працаваць не па-ўдарнаму. З прычыны паслабленьня ўвагі фабрычных арганізацый, у кастрычніку прамфінплян быў выкананы на 89 проц. Лістапад ня даў аруху.

З 1-га сьнежня фабрыка абвясьціла месячнік штурму па ліквідацыі прарыву. Праведзеная шырокая растлумачальная рбота у цэхах ускалыхнула рабочы калектыў. аД гэтага часу падасьнеў ток з Асінбуду. Крывая выпрацоўкі пайшла ўверх.

За 15 дзён сьнежня фабрыка выканала **прамфінплян на 11 проц.,** а за чацьвертую пяцігодку сьнежня—на 124 проц.

10-га сьнежня цэхлеёвы цэх і цэх фіцу скончылі праграму ўдарнага кварталу. Узятыя тэмпы даюць гарантыю, што не пазьней 29 сьнежня фабрыка скончыць прамфінплян ударнага кварталу і ліквідуе запазычанасьць другога году пяцігодкі.

Адной з вялікіх заслуг фабрыкі зьяўляецца тое, што з пачатку ўдарнага кварталу яна зусім адмовілася ад імпартнага сырцу, і перайшла на мясцовы сырэц. Гэта дае вялікую эканомію залатой валюты. Якасьць прадукцыі ад мясцовага сырцу не пагоршылася, а часамі нават лепшая, чым раней.

Рацыяналізацыя, выпаходзтва і рабочыя прапановы займаюць вялікае месца ў працы фабрыкі. За ўдарны квартал паступіла 296 работых прапаноў, з якіх ужо выканана 106. У плян рацыяналізацыі на 1931 г. уключаны 15 работых прапаноў, якія дадуць каля 26.000 руб. эканоміі.

Зараз ужо складзены рацыяналізатарскі плян на 1931 год. Па ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў будзе выдаткавана каля 32.000 руб. Ад ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскага пляну фабрыка павінна атрымаць 180.000 руб. эканоміі. 17 рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў ва ўдарным квартале даюць ужо 11.000 руб. эканоміі.

Фабрыка дабілася вялікіх посьпехаў у барацьбе за пяцігодку—за чатыры гады.

Але работа партыйных і прафесыянальных арганізацый фабрыкі мае рад сур'ёзных недахопаў. Пагрэбізна на рабоце заводзкіх арганізацый мы спынім[illegible] ў наступным нумеры.

Ф.

Дапамаглі вытворчыя манэўры

Менская цукеркавая фабрыка **«Камунарка»** 22-га сьнежня выканала сустрэчны прамфінплян па ўсіх паказальніках. На першым месцы ідзе бісквітны цэх. на другім—карамельны, па трэцім—мякка-чакалядны.

У лістападзе фабрыка арганізавала вытворчыя манэўры, якія значна павялічылі вып[illegible] прадукцыі і палепшылі якасьць.

У сувязі з агляданым, арганізаваным «Зьвяздой», фабрыка «Камунарка» правядзіць вытворчыя манэўры па падрыхтоўцы да трэцяга году пяцігодкі.

ПЕРАРЫВАРЫ САВЕТАЎ

Павярнуць гарсавет тварам да вытворчасьці

Работу Менгарсавету—пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі

РАШУЧА ВЫГАНЯЦЬ АПАРТУНІСТАЎ І ПРЫМІРЭНЦАЎ З КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ САВЕТАЎ.—ПЕРШАЕ МЕСЦА У ГАРСАВЕЦЕ—ЛЕПШЫМ РАБОЧЫМ-ЎДАРНІКАМІ

НАБЛІЖАЮЦЦА ПЕРАВЫБАРЫ ГАРСАВЕТАЎ

Пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) асабліва выразна падкрэсьліваюць палітычнае значэньне кампаніі перавыбараў саветаў, якія зараз праходзяць у нашай краіне.

Узьняць ролю саветаў у правядзеньні на практыцы генэральнай лініі партыі, карэнна перабудаваць работу саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду—гэтым вызначаюцца асноўныя палітычныя задачы перавыбараў.

У бліжэйшы час заканчваецца першы этап кампаніі—перавырабы сельсаветаў. Мы ўступаем у другі адказнейшы перыяд кампаніі—**перавыбары гарсаветаў.**

З пачатку студзеня 1931 г. пачынаецца справаздачная кампанія Менскага гарсавету. Трэба зараз-жа прыступіць да арганізацыі шырокай хвалі пралетарскай самакрытыкі вакол работы Менскага гарсавету

Побач з падвядзеньнем вынікаў дасягненьняў у рабоце гарсавету, мы павінны ўзяць пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі ўсе недахопы дзейнасьці гарсавету, якая (дзейнасьць) зьяўляецца асабліва адказнай, бо яна праходзіць у сталічным цэнтры БССР.

Рабочыя-выбаршчыкі павінны суровa праверыць, як гарсавет ажыцьцяўляў у сваёй рабоце генэральную лінію партыі, што зроблена ім для ажыцьцяўленьня важнейшых пунктаў наказу, для ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай плятыкі; наколькі гарсавет зьдолеў арганізаваць масы вакол сваёй работы, якія меры ўжываў гарсавет, каб перабудаваць сваю работу тварам да вытворчасьці, да задач выканаьня прамфінпляну, якую дапамогу аказаў гарсавет у справе калектывізацыі вёскі, у справе ажыцьцяўленьня пралетарскага кіраўніцтва перавыбарамі на вёсцы і арганізацыі калгаснікаў, батракоў і бядняка-серадняцкіх мас для рашучага адпору кулацтву.

Асабліва жорсткая самакрытыка павінна быць разгорнута вакол работы гарсавету ў пытаньнях рабочага забясьпечэньня, грамадзкага харчаваньня, кватэрнага будаўніцтва, дабрабыту горараду і забясьпечэньня рабочых дровамі.

Рабочыя масы на справаздачных сходах павінны выкрыць усе недахопы і прарывы у рабоце гарсавету. Рабочыя, зразумела, зусім правільна зробяць, калі яны таксама будуць выкрываць усіх канкрэтных винаватых у гэтых прарывах, **хто б ні каю ны ня асобы**, усіх тых, хто аказаўся нездольным стаяць на чале кіраўніцтва гарсаветам і яго органамі.

У часе перавыбарчай кампаніі трэба рашуча ачысьціць гарсавет і кіраўніцтва гарадзкімі савецкімі установамі ад апартуністаў усіх масьцей у першую чаргу ад правых апартуністаў, бо «ў перыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня партыя асабліва ня можа мірыцца з правапартуністычнай практыкай у кіраўніцтве савецкімі органамі, якая (практыка) ня толькі не забясьпечвае прынятых бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва і пасьлядоўнай барацьбы з бюракратызмам—на аснове разгорнутай пралетарскай самакрытыкі, але на справе азначае сабатаваньне, а досыць часта і просты зрыў важнейшых дырэктыў партыі». (З пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК).

Партячэйкі Менскай арганізацыі на аснове апошніх пастаноў пленуму ЦК і ЦКК, павінны накіраваць усе свае сілы на пасьпяховае правядзеньне перавыбараў.

Трэба дабіцца 100 проц. ўдзелу выбаршчыкаў на перавыбарчых сходах, пад кіраўніцтвам партыі разгарнуць жорсткую бальшавіцкую самакрытыку работы гарсавету, узмацніць клясавую пільнасьць мас.

Толькі пры такіх умовах пачаўшаўшыны гарсавет, склад якога трэба карэнным чынам палепшыць за лік ударнікаў-энтуазіястаў сацыялістычнага будаўніцтва—толькі гэты склад гарсавету будзе клясава-базадольным і здолее ўсю сваю работу падпарадкіць задачам рэканструкцыйнага перыяду.

М. З.

Перавыбарчы лёзунг на заводзе «Камунар»

Рабочыя брыгады правяраюць, як выканан наказ гарсавету

25 сьнежня адбылася агульна-гарадзкая нарада брыгад і камісій салідарнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету.

Адказны сакратар гарсавету тав. Пасынкоўскі выступіў з дакладам аб задачах брыгад і камісій у правядзеньні перавыбараў. Нарада выказала канкрэтныя мерапрыемствы для забясьпечэньня актыўнага ўдзелу мас у справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Камісіі і брыгады на прадпрыемствах ужо прыступілі да праверкі работы гарсавету з пункту погляду выкананьня апошняга наказу выбаршчыкоў. Будзе таксама праверана выкананьне дадатковаго наказу, унесеных на справаздачна-перавыбарчых сходах гарсавету ў мінулым годзе.

На нарадзе высьветлілася, што калідарны плян справаздачна-перавыбарчай кампаніі распрацаваны гарсаветам невыстарчальна і не забясьпечвае стопроцантнага ўдзелу выбаршчыкаў.

„Энэргія“ прымае выклік „Камунара“

Лёзунг рабочых--„Лепшых ударнікаў--на работуў гарсавет“!

Рабочыя, інжынэрна-тэхнічныя работнікі і служачыя чырвонасьцяжнага заводу «Энэргія» праз газэту «Зьвязда» зьвярнуліся з лістом да рабочых заводаў «Камунар» і «Ўдарнік».

Завод «Энэргія» прымае выклік заводаў «Камунар» і «Ўдарнік» на сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбараў гарсавету.

Рабочыя «Энэргіі» разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва па 100-процантным ўдзел у перавыбарчых сходах, па выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. Праведзены ў ліку ударнікі па цэхах. У часе падрыхтоўкі арганізаваны дзьве камуны і адна ўдарная брыгада. Праведзена дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», якая дала звыш 10 тысяч рублёў. Арганізован суботнік па зборы металялому. Вучні прымацаванай да заводу 20-ай школы правялі карнавал, на якім заклікалі сваіх бацькоў і ўсіх рабочых «Энэргіі» прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах гарсавету.

Рабочая брыгада заводу дапамагае перавыбарам сельсаветаў у падмэйным Сьмілавіцкім раёне. Вынікі работы брыгады ўжо два разы друкаваліся ў «Зьвязьдзе».

Рабочыя заводу «Энэргія» абяцаюць даць самы рашучы адпор клясава-варожым элементам, якія будуць імкнуцца скарыстаць перавыбары ў сваіх інтарэсах, якія робяць спробы пралезьці ў органы дыктатуры пралетарыяту, а таксама правым і «левым» апартуністам—агентам клясавага ворага.

Лёзунг рабочых «Энэргіі»: «Лепшых ударнікаў—у дэпутаты менскага гарадзкога савету!»

Цішоўкі выконваюць сацдагавор

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). У нумары 290 «Зьвязды» была зьмешчана заметка «Падхапіць ініцыятыву цішаўцаў», у якой прыведзен тэкст сацыялістычнага дагавору Цішоўскага сельсавету на лепшае правядзеньне перавыбараў.

Арганізацыі Цішовак зараз выконваюць прынятыя на сябе абавязкі.

Справаздачна-перавыбарчы сход, які адбыўся на першым выбарчым вучастку Буйнічы, паказаў, што падрыхтоўка да перавыбараў праведзена здавальняюча. Перад сходам былі праведзены нарады мацадзі, жанчын і бедняты, на якіх ставіліся даклады аб перавыбарах, абгаварваліся кандыдатуры, выбраны ўдарныя брыгады па абходзе двароў і выкліку на сходы. У дзень перавыбараў у буйніцкай школе арганізаваны ясьлі, якія абслужылі больш 50 дзяцей. Перад сходам адбылася вучнёўская дэманстрацыя пад лёзунгам— «Усе на перавыбарчыя сходы».

Выбаршчыкі вёскі Буйнічы прышлі на сход стройнай калёнкай, на чале з духавым аркестрам.

На сход зьявілася 69,4 проц. выбаршчыкаў, з іх 60 проц. жанчын. У склад сельсавету выбрана 5 чалавек і дэл кан дыдаты—з іх два сельгасрабочыя, адзін батрак, адзін бадняк, два малапосныя сераднякі і адзін настаўнік. З 5 членаў сельсавету—2 жанчыны. Удзельная вага партыйнай часткі ў сельсавеце складае каля 40 проц. З.

ЭПАР ПланСкан А2В

ТЭАТР

Паказ клясавых перамог

(„Першая конная“ ў БДТ2)

Беларускай драматычнай студыяй у Маскве, студыяй, з якой нарадзіўся БДТ-2, была ўсвоена старая, МХАТ'аўская тэатральная культура без адсінкі і перамаганьня яе рэакцыйнай сутнасьці. Калі яшчэ ладаць, што гэты малады тэатр доўгі час імкнуўся скарыстаць (і гэта ім у пэўнай меры ўдавалася) нацыянал-дэмакраты і што ён у пэўнай ступені быў адарваны ад рэвалюцыйнай сучаснасьці, — дык стане зразумелым зьдзіўленьне ў яго рэпэртуары такіх рэчаў, як «Бакханкі», «Эрос і Псыхэ», «Апраметная».

Пад націскам партыйнай і савецкай грамадзкасьці тэатр прымушан быў найсьці насустрач сапатрабаваньням працоўнага гледача, найсьці на шляху стварэньня ідэалёгічна - вытрыманага пралетарскага рэпэртуару.

Такім чынам, сэзон 1928-29 году даў **«Разлом»** Лаўрэнева, **«Калі сьпяваюць пеўні»** Юр'іна, **«На прадвесьні»** Ільінскага. Усе гэтыя п'есы больш - менш сугучныя эпосе.

Нарэшце, мы маем у апошнія часы **«Авангард» і «Горад вятроў».**

Паварот БДТ-2 да выпраўленьня сваіх вялікіх памылак (паварот не абыйдзецца, праўда, бяз пэўных хістаньняў) і зрываў) і абумовіў зьяўленьне ў ім **«Першай коннай» Ус. Вішнеўскага.**

Ап. Некрашэвіч у студзені г. г. гаварыў:

«Беларускі другі дзяржаўны тэатр, як тэатр, што мае пэўную ідэйную мастацкую школу і найбольш малады акцёрскі склад, павінен стаць на баявы пазыцыі беларускага пралетарскага тэатральнага мастацтва».

(«Далейшае разьвіцьцё тэатральнае справы на Беларусі» — «Маладняк», № 1).

«Першая конная» даводзіць, што **БДТ-2 сапраўды імкнецца стаць на гэтыя «парадовыя пазыцыі».**

Кожны радок вялікай паэмы пра конны корпус С. М. Будзённага ў інтэрпрэтацыі рэжысэра Таўраўроўскага гучыць важка і пераканаўча.

... Царская армія. Шумныя парады войск і — нечаканае, цяжкае жыцьцё ў казармах...

Фронт. Вайна. Рэвалюцыя.

Пераломы ў настроях мас.

Пачынаецца стварэньне партызанскіх атрадаў, з якіх потым вырастае першая конная армія.

Гады будаўніцтва. Старыя будаўнічыя змагаюцца за сёньняшні бальшавіцкі будні.

Вось — заснаваная пітка спэктаклю.

Пастаноўка мае вялізнае агітацыйнае значэньне, правільна адлюстроўваючы слаўную барацьбу Чырвонай арміі. Артысты і рэжысэр здолелі паказаць гапа грамадзянскай вайны, калі малая, але клясава-сьвядомая, Чырвоная армія, пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі Леніна, атрымлівала рад перамог над Дзянікіным, Урангелем і іншымі белымі генераламі, змагалася за рабоча-селянскую савецкую ўладу.

Пастаноўка «Першай коннай» паказвае як, загартоўваючыся ў баёх, вырастаў клясава-сьвядомы чырвоны баец, калектыў-атар вёскі, ударнік на заводзе.

Новымі ўдарнымі мэтадамі пастаўлена «Першая конная». Тут няма «прэм'ерэў» і «прэм'ер». Тут — жывая, дынамічная маса будзённаўцаў!

У «Першай коннай» тэатр імкнуўся паказаць на сцэне сапраўдныя рэвалюцыйныя падзеі.

Не гранітны помнік Першай коннай арміі, а мастацкая перадача падзей эпохі — вось у чым сэнс пастаноўкі.

І не дарма ў лёсьце калектыву БДТ-2 байцы, начальніцкі склад і партарганізацыя чырвонасьцяжнага кавалерыйскага Стаўропальскага палка пішуць:

«Мы з задаваленьнем адзначаем, што 2-гі Белдзяржтэатр за час свайго культшэфства над нашым палком узяў правільную лінію, паказваючы палку усю сваю творчасьць, якая адбівае гэраічную барацьбу рабочае клясы пад кіраўніцтвам УсеКП(б) за ўмацаваньне Кастрычніцкіх заваяваньняў і будаўніцтва сацыялізму, чым і спрыяе ўмацаваньню баявой магутнасьці палка,— яго рэвалюцыйнай загартаванасьці... «Першая конная» ў момант ваеннай небясьпекі, што насоўваецца супроць Савецкага Саюзу, мабілізуе ўвагу працоўных Савецкай Беларусі для яшчэ большага ўмацаваньня сувязі з Чырвонай арміяй і павышэньня абароназдольнасьці Савецкага Саюзу».

У гэтай, як можа ці ў якай іншай пастаноўцы, **тэатр знайшоў сынтэз паміж сваім папярэднім фармальным разьвіцьцём і вымаганьнямі сёньняшняга дня.** Амаль усе віды мастацкага ўзьдзеяньня ўведзены ў «Першую конную»: музыка, сьпевы, скокі, кіно радыё...

Часткова тэатру ўдалося разьвязаць і вельмі цікавую праблему сьцэтавых дэкарацый.

Нават файэ тэатру выглядае па-іншаму. Са сьцен пазіраюць партреты правадыроў Чырвонай арміі, экспанаты Асоавіяхіму, карціны баёў часоў грамадзянскай вайны. Усё гэта яшчэ перад паказам алпаедным чынам падрыхтоўвае глядача і спрыяе вялізарнаму ўражаньню ад пастаноўкі.

Ёсьць і пасобныя недахопы. **Найбольш слабое месца — паказ будзённаўцаў у пэрыяд сацыялістычнае рэканструкцыі.** Тут, па сутнасьці, рэжысэр не найшоў далей «заякраньваньня» момантаў будаўніцтва. Жывых людзей няма...

Малавата сьвятла. Завадта хутка мільгацяць надпісы і чытальнасьць іх слабая.

Але ў гарманічным цэлым «Першая конная — гэта 1-ая Конная! Яе трэба бачыць... Яе трэба папулярызаваць у найшырэйшых колах працоўных.

Гэтая пастаноўка — новае заваяваньне БДТ-2 на яго творчай дарозе. Яна набліжае малады тэатр да сапраўды-пралетарскіх пазыцый у галіне сцэнічнага мастацтва.

Юр. Лявонны.

Дзе вандруюць пасылкі з лёзунгамі да перавыбараў

Ці ня дзейнічае тут рука клясавага ворага

13-га сьнежня ў газэце «Савецкая Беларусь» было зьмешчана паведамленьне адказнага сакратара Цэнтральнай выбарчай камісіі тав. МІКУЛІЧА аб тым, што 12-га сьнежня ў раёны пасланы лёзунгі і плякаты да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў і што лёзунгі, прысьвечаныя перавыбарам у нацсаветах, будуць пасланы дадаткова поштай.

АСЬВЕЙСКІ РАЁН, які знаходзіцца ад чыгункі за 35 клм., да 18-га сьнежня не атрымаў першай пасылкі, а другую атрымае, мабыць, у будучым годзе. Перавыбары саветаў па Асьвейскім раёне пачаліся 10-га сьнежня, кампанія скончыцца да 25-га, такім чынам лёзунгі і плякаты прыйдуць у раён пасьля таго, як усе сельсаветы будуць перавыбраны. Асьвейскі раён не адзін. Ёсьць раёны, якія знаходзяцца на адлегласьці 90-100 клм. ад чыгункі. Калі туды дойдуць лёзунгі Цэнтральнай выбарчай камісіі? Хто вінаваты ў гэтым?

БЭРЫН.

АД РЭДАКЦЫІ. Рэдакцыі вядома, што гэта ўжо другі выпадак затрыманьня перавыбарчых матар'ялаў, пасланых Цэнтральнай выбарчай камісіяй. Патрэбна тэрміновае расьсьледваньне Цэнтральнай выбарчай камісіі і пракуратуры траба неадкладна ўмяшацца ў гэту справу.

Ачысьцім апарат аб'яднаньняў Наркамгандлю гд шкоднікаў і бюрэкратаў

Пачынаецца чыстка апарату аб'яднаньняў Наркамгандлю (Белмяса, Белрыбы, Белсадагароднінны і Белсельпрамаб'яднаньня). Чыстка павінна прыцягнуць да сябе увагу шырокіх мас пралетарскай грамадзкасьці. Аб'яднаньні Наркамгандлю адыгрываюць вельмі важную ролю ў выраішэньні харчовай праблемы, у справе ліквідацыі харчовых труднасьцяй, якія мы зараз адчуваем. Пасьпяховае выраішэньне гэтых задач патрабуе рашучага ачышчэньня апарату ад бюрэкратаў, шкоднікаў, клясава-варожых элементаў, ад работнікаў, якія ня здольны пераключыцца на баявыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Цэнтральная камісія па чыстцы аб'яднаньняў Наркамгандлю зварачаецца да ўсёй партыйнай, прафсаюзнай і савецкай грамадзкасьці з просьбай прыняць актыўны ўдзел у чыстцы, прысылаць у камісію матар'ялы як аб работе аб'яднаньняў, так і аб пасобных работніках.

Толькі актыўны ўдзел шырокіх мас працоўных, у першую чаргу рабкораў, рабочых з прадпрыемстваў Наркамгандлю і грамадзкіх арганізацый пералічаных вышэй устаноў зможа забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне чысткі.

Старшыня камісіі па чыстцы аб'яднаньняў Наркамгандлю КОФМАН.

Т. т. Рак-Міхайлоўскі, Мятла, Бурсэвіч і Грэцкі--у Бабруйску

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 26 сьнежня ў Бабруйск прыбылі былыя паслы польскага сойму, прэвадыры Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады — т.т. РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, МЯТЛА, БУРСЭВІЧ і былы пасол беларускага клюбу «Змаганьне» — т. ГРЭЦКІ.

Арганізаваўся яўрэйскі ТРАМ

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У Гомелі арганізаваўся яўрэйскі тэатр рабочай моладзі (ТРАМ). Калектыў ТРАМ'у налічвае 30 чалавек, пераважна-рабочых ад вартыштату. Тэатр створаны пры непасрэдным дапамозе беларускага дзяржаўнага яўрэйскага тэатру.

Спыніць нарэшцэ зьдзекі!

Тры з паловай гады таму назад у Савецкі Саюз прыехаў з фашысцкай турмы Польшчы тав. Жабінскі. У турмах панскай Польшчы ён пакутаваў 5 год. Палітэмігрант і вязень фашысцкіх турмаў меў права разьлічваць на спачуваньне і дапамогу з боку савецкіх установаў. Працу. Жабінскі знайшоў вельмі хутка. І гэта зразумела: кваліфікаваных працаўнікоў - партыйцаў у нас не хапае. Горш справа была з кватэрай. За ўвесь час свайго прабываньня ў Савецкім Саюзе тав. Жабінскі разам з сям'ёй знаходзіўся ў самых дрэнных жыльлёвых умовах. У чэрвені мінулага году ён літаральна апынуўся на вуліцы. Прышлося сям'ю вывезьці ў вёску да таварыша, а самому блукаць па кватэрах партыйцаў, каб з верасьня месяца жыць на рабоце і пачаваць на рэдакцыйных сталох.

Немагчымае становішча, у якім жыў тав. Жабінскі, прывяло да ўмяшаньня ў гэту справу райкому і акругкому партыі, якія праз камісію гарсавету па разьмеркаваньні кватэр дабіліся дай тав. Жабінскага і яго сям'і кватэры з 2-х пакоўў на Старажоўскай вул., № 1.

Здавалася-б, што мытарствы палітэмігранта Жабінскага, ценнага і патрэбнага работніка, закончыліся. Але ня тут справа была. Пасьля пераезду Жабінскага ў адведзеную яму кватэру, калі яго ня было дома, усялёўся нейкі Еленевіч а жонкай Зялёнка, які жыў у гэтым дварэ. Еленевіч і Зялёнка выдаюць сябе за чыстакроўных пралетараў таму, што ён працуе ў Менцвэі, а яна — у гузічнай арцелі. Ня здаецца, што Еленевіч, а асабліва Зялёнка, якія зьвязаны песна з кулацкім асяродзішчам у вёсцы, не выпадкова паступаюць як хуліганы ў адносінах да палітэмігранта Жабінскага і яго сям'і, выжываючы іх з законна зайнятай апошнім кватэры.

Еленевіч, самавольна заняўшы пакой і замаскаваўшы яго за сабой ашуканствам, бо ён заявіў пракуратуры, што заняў ня частку чужой кватэры, а вольны камгаскі пакой, — разам са сваёй жонкай пачаў рабіць усё, каб атруціць жыцьцё Жабінскаму і яго сям'і: пастаянныя аборы моладзі штодня да 2 гадзін ночы, вечарыны з гармонікам і г. д. аж да фізычных мэтадаў выжываньня. Аб такіх «дробязях», як недапусканьне сям'і Жабінскага ў пакой, як дробнае шкодніцтва, або бульварная лаянка ды нават і збойства, мы расьпісвацца ня будзем. Даволі сказаць, што ўсе пахаджэньні хуліганскай пары Еленевіча і Зялёнка скончыліся пастановай нарсудзьдзі аб высяленьні гэтай сям'і з кватэры Жабінскага. Аднак, пракуратура стаяла на варце. І хаця Зялёнка на працягу некалькіх месяцаў падпадала штрафам за хуліганства, а 25 лістапада за хуліганства асуджана нарсудом да 2-х месяцаў прымусовых работ, пракуратура пастанавіла прыгарар народнага судзьдзі скасаваць і хулаганаў, якія зьдзекваліся над Жабінскім, пакінуць у кватэры і гэтым патрацць іх далейшым учынкам. Ня дзіва, што кулацкія парасткі — Еленевіч і Зялёнка дазваляюць сабе кідаць пляму на рабочую клясу і свае хуліганскія ўчынкі прыкрываюць антыпралетарскім лёзунгам: «Мы рабочыя, нам усё дазволена». Нам здаецца, што калі шмат дазволена Еленевічу і Зялёнка, то не таму, што яны зьяўляюцца рабочымі, бо рабочыя не дазваляюць сабе хуліганства, асабліва, у адносінах да сваіх таварышоў, а таму, што Еленевіч і Зялёнка на сустрэлі належнага адпору з боку грамадзкасьці і пракуратуры. Наадварот, калі Жабінскі быў прыкрыт на вайсковую перападрыхтоўку і высхаў у Смаленск, то пам. пракурора Есіпевіч загадаў Еленевічу і Зялёнка бессаромна зламаць замкі ў кватэры Жабінскага і заняць яе гвалтам. Нам. пракурора Шыфрын у адказ на скаргу жонкі Жабінскага з поваду гэтага спачатку запытаў, хто яна, а дакладуючыся, што яна жонка Жабінскага, запытаў яшчэ раз, ці тавар. з ям мае справу Еленевіч?», а потым даваў: «Ды гэта я іх усіліў».

Калі тав. Жабінскі зьвярнуўся да пракурора тав. Валасевіча, той ня толькі ня ўзяў Жабінскага пад абарону, ня толькі не арганізаваў дэтальнага расьсьледваньня гэтай абурэючай справы, але накінуўся на тав. Жабінскага з «правоўчаньнямі», кваліфікуючы ўсю справу, як «кухонныя склокі» у той час, калі ў выніку гэтых кухонных склок тав. Жабінскі жыве з двухгадовым дзіцём у пакоі бяз печкі, дзе пануе сабачы холад, а вільгаць забівае ня толькі дзіця, але ўсю сям'ю.

Неабходна адначаць характэрную рысу ў выступленьні пракурора тав. Валасевіча. Тав. Валасевіч лічыў магчымым зрабіць наступную заяву ў гутарцы з тав. Жабінскім: «Заметку з газэты «Рабочий» аб вашай справе я перасłаў у парткалегію ЦКК. «Рабочий» выкарыстаў сваё становішча для ўстройства свайго супрацоўніка». Тав. Валасевіч дапусьціў, мякка гаворачы, дзьве недакладнасьці: **ён не перасłаў справу тав. Жабінскага ў ЦКК,** бо да сённяшняга дня ў парткалегію ЦКК справа, якая датычыць кватэры тав. Жабінскага, не паступала. Па-другое, тав. Жабінскі не зьяўляецца супрацоўнікам газэты «Рабочий», а калі-б і зьяўляўся, то газэта **«Рабочий» абавязана была заступіцца за тав. Жабінскага, над якім зьдзекуецца пара хуліганаў, кулацкіх парасткаў,** хаця-б гэта пара хуліганаў мела ў кішэні білет прафсаюзу і магла, такім чынам, схавацца пад імем рабочых ад варштату.

Мы доўга маўчалі аб справе Жабінскага. Прычынай нашага маўчаньня быў той факт, што тав. Жабінскі з вытрыманасьцю, вартай партыйца, пераносіў усе зьдзекі і чакаў, што савецкая пракуратура зможа абараніць яго законныя правы. **Мы далей маўчаць ня можам,** хаця палітэмігрант Жабінскі і зьяўляецца супрацоўнікам «Зьвязды» і тав. Валасевіч з поўным правам будзе гаварыць аб тым, што мы ўзялі пад абарону нашага супрацоўніка. Гэтай дэмагогіі мы раней даем адпор. Пасьля 3½ год мытарстваў палітэмігранта Жабінскага, які сапраўды працуе ў цэнтральным органе партыі — «Зьвязда», мы патрабуем у адносінах да яго справядлівасьці і спыненьня зьдзекаў над ім.

Слова за Цэнтральнай Кантрольнай Камісіяй, слова за адпаведнымі органамі. Палітэмігран Жабінскі, вытрыманы камуніст і адданы работнік партыйнага друку на фронце нашага сацыялістычнага будаўніцтва, павінен адчуць, нарэшце, што ён сапраўды знаходзіцца ў пралетарскай бацькаўшчыне, прытчаных усяго сьвету.

Папраўка

Ва ўчарайшным нумары «Зьвязды» пры вёрстцы артыкулу: «Крывавы шлях беларускіх нац.-дэмакратаў» дапушчаны па віне друкарні наступныя тэхнічныя памылкі.

У канец першай калёнкі пасьля слоў: **...«яны сабраліся на...»** памылкова зверстаны наступны радок:

—«ская дружына, 6 Таўрогенскі полк, 48...»

У другой калёнцы на 61 радку пасьля слоў: **...«Беларусізуецца 357 віцебская і 401 Мен-...»** памылкова выкінуты наступныя словы:—**«ская дружына, 6 Таўрогенскі полк, 48» і г. д. і г. д.**

У гэтай-жа калёнцы пасьля слоў: **...«А калі» прапушчана лінейка, якая адзяляе канец другой калёнкі ад вышкі.**

Рабочыя „Чырвонага Мэталіста“

„ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА“ ЧАКАЕ ВАШАЙ ДАПАМОГІ

ДУБРОЎНА. (Па тэлеграфу). Фабрыка **«Дняпроўская Мануфактура»** атрымала ток ад Асіпбуду. Гэта павінна значна паляпшыць і ўзьняць прадукцыйнасьць працы, палепшыць асьвятленьне ў цэхах. На жаль, фабрыка ня можа прыняць ток, бо віцебскі завод «Чырвоны Мэталіст» марудзіць з выкананьнем заказу фабрыкі—20 падшыпнікаў і 3-х шківаў.

Праверачная брыгада «Дняпроўскай мануфактуры».

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя «Зьвязды» зьвяртае ўвагу «трыкутніка» і ўсяго рабочага калектыву заводу «Чырвоны Мэталіст» на тэлеграму рабочых «Дняпроўскай Мануфактуры». Рабочыя «Чырвонага Мэталіста», давядзіце справу, што вы здольны змагацца за бальшавіцкія тэмпы, дапамажыце дубровенцам прыняць ток Асіпбуду. Заказ «Дняпроўскай мануфактуры» павінен быць выкананы ва што-б там ні стала.

Сталоўка—горшы цэх

Парткалектыў і вайком гомельскай віпэйнай фабрыкі **«Камінтэрн»** не мабілізавалі рабочых вакол генэральнага агляду прамысловасьці. Задачы агляду вельмі слаба папулярызаваны ў цэхах.

Праверачныя брыгады выявілі, што прасы ў цэхах расхістаны і ў выніку не даюць належнай колькасьці і якасьці прадукцыі. Машыны і прасы, якія псуюцца, свячасова не рамонтуюцца. На фабрыцы-ж няма ні аднэй запаснай машыны. Гэта часта выклікае прастої. Асабліва пагражальнае становішча ў шаначным цэху, дзе інвэнтар больш аношаны. У піджачным цэху накапілася каля 4.000 піджакоў толькі таму, што свячасова ня былі адрамантаваны пецельныя машыны.

У часе агляду мэханікі абавязаліся напярэдадні выхадных дзён рамантаваць машыны. На фабрыцы арганізуюцца групы «прыяцеляў машын».

Рабочая сіла скарыстоўваецца нерацыянальна. Часта на адзін і той-жа працэс выдучаецца некалькі рабочых, а на другі дзень застаецца адзін. Нерацыянальна жарыстоўваюцца і жанчыны. На асноўных працэсах жанчын зусім няма, ня гледзячы на тое, што іх кваліфікацыі яны здольны былі-б выконваць гэту работу.

На многіх працэсах работы замест 3-х чалавек, можна абыйсьці па 4-5. На фабрыцы ёсьць 16 рэзервовых рабочых, якія атрымліваюць пэнсію па 5 разраду, але фактычна нічога на робяць.

Якасьць прадукцыі бручна-ангельскага цэху нізкая, з прычыны дрэннай работы закройнага цэху. Праверачныя брыгады высунулі прапанову арганізаваць «скоізную» брыгаду, якая-б уважала на работу бручна-ангельскага і закройнага цэхаў.

Культурна-выхаўчая работа на фабрыцы не ачуваецца. За апошні час не арганізавана ні аднэй ударнай брыгады. Ёсьць нават ілжэ-ударнікі.

Сталоўка — самы горшы цэх фабрыкі. Якасьць сьпеданьняў вельмі дрэнная, сьпеданьне падаецца заўсёды ў халодным выглядзе. Таму частка рабочых заўсёды шукае сьпеданьня ў іншых сталоўках і позьніцца на работу. Ля буфету заўсёды вялікая чарга.

Д. НЯВЕЛЬСКАЯ.

ЛІСТ БЕЛАРУСКІМ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ І ПРАЛЕТАРСКІМ ПІСЬМЕНЬНІКАМ

Дарагія таварышы!

Ленінская нацыянальная палітыка савецкай улады забясьпечыла нябывалы росквіт нацыянальных культур народаў СССР. Беларускі працоўны народ, вызвалены ад палітычнага, эканамічнага і духоўнага ўціску старой самадзяржаўнай Расіі, хутка пайшоў на шляху разьвіцьця сваіх творчых сіл. Беларускае мастацтва і літаратура маюць ужо рад сваіх яркіх і таленавітых прадстаўнікоў.

Інтарэсы далейшага разьвіцьця рэвалюцыйнага мастацтва і літаратуры народаў Савецкага Саюзу дыктуюць неабходнасьць устанаўленьня самай шырокай сувязі і пастаянных узаемаадносін паміж культурамі народаў СССР. Зьбліжэньне і сумесная прапрацоўка пытаньняў мастацтва і літаратуры дадуць магчымасьць дабіцца далейшых посьпехаў у справе будаўніцтва культуры і мастацтва СССР.

У «тыдзень Беларусі» — пісьменьнікі ўсіх арганізацый, якія ўваходзяць у ФАСП, зварачаюцца да Вас, дарагія таварышы, з запрашэньнем наведаць нас у студзені 1931 г., каб шляхам таварыскіх спатканьняў і гутарак умацаваць узаемную культурную сувязь і агульнымі намаганьнямі, у адпаведнасьці з генэральнай лініяй партыі, навесьці рашучую барацьбу як з мясцовым, так і з інтэрнацыянальным нацыяналізмам, барацьбу з рэшткамі капіталізму ў нашай краіне і рэшкамі правымі яго ідэалёгіі ў мастацтве і літаратуры—у імя вялікага сацыялістычнага мастацтва будучыні.

ФАСП: А. БАГДАНАЎ, Г. КАРАНЕЎ, Хв. ГЛАДКОЎ. М. КОЛАСАЎ. Ул. КІРЫЛАЎ.

Паведамленьні

Да ведама райнамолаў, чэек і дэпэгатаў 10-га зьезду ЛКСМБ.

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ паведамляе, што **10-ты зьезд ЛКСМБ адкрываецца 5 студзеня 1931 г.**

СЕНЬНЯ:

— КУБ. У 19 з пал. гада., у ленінск. аўд. (пак. № 25)—працяг спрэчак па дакладу т. Выдры аб чарговых задачах на філёзофскім фронце.

— Менскі Дом Чырвонай арміі. У 20 гадз.—даклад т. Чапліна «Дзейнасьць Р. А. і дзейнасьць перадавых батальёнаў». 30-XII у 20 гадз.—даклад т. Пулка-Дзьмітрыева «Вайсковая падрыхтоўка за мяжой».

— Дом Асьветы. У 19 гадз.—сход узводу сувязі на вытворчых манэўрах. Прызначаны на 29-XII вечар бядлейшых вучняў пераносіцца на 30 сьнежня.

— Подгабінэт. У 20 гадз.—заключны сход роты інтэрнацыянальна-клясавага і антырэлігійнага выхаваньня.

— Нац.-дасьл. інст. сьвінагадоўлі. У 18 гадз., у пам. мэд. корпусу, 1 паверх,—агульны праф. сход прадаўпікоў інстытуту. Яўка абавязкова.

— Дом Асьветы. 29-XII—дыспут на тэму **«Клясавая барацьба ў беларускай літаратуры».** Уступнае слова тав. Сянкевіча.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

СЕНЬНЯ, 28 сьнежня—для ПАЛКА ДПУ

У. Вішнеўскі.

„ПЕРШАЯ КОННАЯ“

прысьвечана Чырвонай арміі.

Пастаноўка У. Таўраўроўскага. Мастак Б. Матрэніч. Музыка Старагародскага. Фото для сьцэтавых дэкарацый І. Савасьцёўна. Дырыжэр І. Гітгарц. Хормайстэр В. Нафтман. Пам. рэж. Л. Бунькін.

ПАЧАТАК роўна у 8 гадз. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“**

ПАВЭЛІЧНАЯ ПРАГРАМА

1. Лепшы замежны фільм **БЯЗБОЖНІЦА** і серыя ў 6 част.

2. Новы гукавы фільм у 2-х частках **Ста ёмых бізьнізьнічім израгам.**

Пач. у 6 г., 7 гадз. 30 м., 9 гадз. 10 г. 30 м. веч. Касы з 5 веч.

КІНО **„Культура“**

Масштаб фільм **БЫТВІЯ РАЗГУДЗІЛА** фільм у праграме

Звыш праграмы

Гастроль Араго—сусьветны катаматык і С. Вронскі—аўтар-сатырык.

Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. КАСА—з 5 гадз.

КІНО **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“**

Нар. арт. рэспублікі **І. М. Масквін** у карціне **Нарадзіўся чалавек**

драма ў 6 частках.

Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса—з 4 г. 30 м.

КІНО **„Гладіятары“**

Новы масштаб фільм **Дачка сьвятога**

драма ў 7 частках.

Звыш праграмы культур-фільм ЛЯТУН

Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. веч. Касы адкрыта з 4 гадз. 30м.

КІНО **„ЮНЫ ПІЯНЭР“**

Два фільмы ў адным сэансе

1) **БОГ ВАЙНЫ**

2) **ВАНЯ-ПІЯНЭР**

Пачатак сэансаў у 1 г. дня і 3 г. дня. Касы адкрыты з 12 гадз. дня

КІНО **„СПАРТАК“**

Выдатны фільм **КРЫЖ І МАЎЗЭР**

драма ў 8 частках.

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. веч.

Каса—з 5 гадзін веч.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 4-месячныя **КУРСЫ АРУ**

па падрыхтоўцы **БУХГАЛЬТАРОЎ** для саўгасаў працягнут **да 6 студзеня.**

Прымаюцца бухгальтары, пімбулі або рахункаводы з 3-гадовым станам.

Курсантам выдаецца **стыпендыя ў 35 р.** у месяц.

Пасьля скончэньня курсоў абавязкова праца ў саўгасах ня менш 2-х год.

Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі АРУ (Савецкая, 55) штодзенна з 6 да 8 г. веч.

Прыём заяў на курсы рахункаводаў спынены.

Завочныя бухгальтарскія курсы

Прыём **слухачоў праводзіцца кругла год.** Прымаюцца всякія з 17-гадовым узростам з асьветай ня вышэй 5 гр. 7-годні

ПЛАТА ЗА КУРС 33 РУБ.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц на 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і пробы накіроўваць на адрасе:

Менск, пошта, скрыпка 44, Завочным курсам

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

З 27 сьнежня па 8 студзеня 1931 г. будзе праводзіцца

ВЫДАЧА НОВЫХ НАБОРНЫХ КАРТАК

працоўнаму насельніцтву г. Менску.

Наборныя карткі выдаюцца па месцы перарэгістрацыі кніжак—па ЖАКТ'ах і пунктах мыцьця.

Для атрыманьня картак неабходна прадставіць наступныя дакумэнты: дамавую кнігу, пашпорт, а для дзяцей да 12 год—матрыка. (У асобных выпадках, калі не паказана выконваемая праца—даведку аб адпоўнай).

Аплата за картку—10 кап.

Выдача праводзіцца ў альфабэтным парадку. Парадак выдачы па ЖАКТ'ах вывешан у ЖАКТ'ах. У адзяленьні міліцыі № 3 (клюб Леніна пас. станцыя). Выдача праводзіцца—у наступным парадку: 28 сьнежня—літары А, Б, В., 29-XII — Г, Д., 30-XII і 31-XII—Е, К. Аб парадку выдачы картак у раёнах Міліцыі № № 1, 2, 4 будзе абвешчана асобна, таксама і па ЖАКТ'ах № 2, 13 і 15.

Рэгістрацыя наборных картак спыняецца ў 29-XII уключна.

Праўленьне МЦРК.

МЦРК паведамляе ўсіх каапэратыўнаважаных

аб тым, што з 30 сьнежня яны павінны зьявіцца ў аддзел разьмеркаваньня дэфіцытных тавараў (Савецкая, 54), для атрыманьня

ТАЛЁНАЎ НА РАМОНТ АБУТКУ

дадаткове.

Аддзел разьмеркаваньня МЦРК.

САМАЯ ПАШЫРАНАЯ Ў СССР ІЛЮСТРАВАНАЯ ЧАСОПІСЬ

ОГОНЕК

ДАЕ СВАІМ ПАДПІСЧЫКАМ У 1931 г. БЕЗПЛАТНУЮ ПАПУЛЯРНУЮ ГІСТАРЫЧНУЮ БІБЛІЯТЭКУ

24 КНІГІ

„ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ“

Выданьне выходзіць пад рэд. І-ва Гісторыкаў-Марксыстаў пры Камуніст. н. Акадэм. ЦВК СССР і пад агульным кіраўніцтвам

М. Н. ПАКРОЎСКАГА

Універсальна шматтомная папулярная бібліятэка „ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ“, што выдаецца ў СССР, якая высьвятляе асноўныя пытаньні сусьветнай гісторыі, прадстаўляе выключную цікавасьць для кожнага пісьменнага працоўнага, як каштоўная крыніца для самаадукацыі і цікавы, захапляючы матэрыял для чытаньня.

24 КНІГІ

„ВСЕМИРНАЯ ИСТОРИЯ“ разьлічана на масавага чытача—парт., праф., камсамольск., рабочы і калгасны актыў, вузоўцаў і як дапаможнік для парт. і прац. школ і ну, саў.

Выданьне будзе багата ілюстрав. партретамі, гравюрамі, здымкамі з дакумэнтаў і факсімілямі. Гадавым падпісчыкам дармова: 2 вялікія маст. шматфарб. ілюстр. карціны.

ПАДПІСНАЯ ЦЭНА на **„ОГОНЕК“** з дадатк. „ВСЕМ. ИСТОРИЯ“ і 2 шматфарб. карцін **21 р.**

Допускаецца растэрміноўка: пры падпісцы—5 р. і за 1 сакавік 4 р.; да 1 мая—5 р.; да 1 ліпеня—4 р.; да 1 верасьня—3 руб. „ОГОНЕК“ без дадатку: на год — 3 р. 25 к.; 6 м.—1 р. 75 к.; 3 м.—90 к.

Падпіску дапасьле выключна на аплату або лістаносцам.

Пераводы ў выдавецтва накіроўваць ня трэба.

Кан. изд. С-ва „ОГОНЕК“, Москва, Страстной бульвар, 11

ПУХАВІЦКАМУ РАЙСЕЛЬБАНКУ

ПАТРЭБНЫ: 1 бухгальтар, 1 эканамічны-плянавік.

Зарплата ня менш 150 руб.

Пісаць па адрасе: Пухавічы, Райсельбанк.

НОВАЯ КНІГА, агульнадаступны стол

„НАША КУХНЯ“

Сыталі Панятоўская і Мінрасава. 558 рэцэптаў розных страў прыстасоўна да сучасных умоў.

Ц. 2 р. 10 к. з перасылкай. Высылаецца наклад. плацежам без задатку.

Москва, 10-Дмитриковская, 30 „МОСТОРГИН“.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“ звяртацца па тел.

2-49

Ленінградзкае абласное выдавецтва

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1931 год

„СТРОЙКА“

ІЛЮСТРАВАНЫ ДВЭСЯЦІДЗЕНЬНІК МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У 1931 годзе **„Стройка“** друкуе творы буйнейшых майстраў мастацкага слова.

У 1931 годзе **„Стройка“** дае рад артыкулаў вядомых літаратурных крытыкоў і публіцыстаў.

Часопісь **„Стройка“** выходзіць у кляровай вокладцы (у 2 колеры). Тэкст ілюстравані мнагалікімі фатаграфіямі і малюнкамі вядомых мастакоў.

Часопісь **„Стройка“** дае свае чытачом 6 сэрый прыложнінай: 12 нумароў літаратурн. мастацк. часопісі **„Звезда“** (кожны нумар часопісі мае зьвыш 200 стар. тэксту) з прыкладам 6 кніг шэдэўраў сусьветнай літаратуры (Дон-Кіхот, Фэўст, збор твораў Пер. Гантаа, Мярэсаўа, выбран. творы Байрана і Шэкспіра). 12 нумароў літаратурнага альманаху „ЛЕНИНГРАД“ з прыложэньнем 12 кніг раманаў і аповесьцяй лепшых савецкіх пісьменьнікаў, 4 мастацкія альбомы „Строительство СССР“ (альбомы багата ілюстраваны фатаграфіямі, малюнкамі і мастацкімі эскізамі).

У часопісях і кнігах дадуць свае творы пісьменьнікі: М. Горкі, К. Федзін, М. Зошчанко, Ю. Тынянаў, Ю. Лебядзінскі, Н. Ціхонаў, М. Казакоў, Л. Варонскі, О. Форш, В. Каверын, Б. Лаўрэнёў, Л. Фадзеў, М. Шкапскі, А. Чапліцін, Н. Чукоўскі, Д. Чацьвярыкоў, А. Слонімскі і інш.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

„Стройка“ без прыклад.: 1 м.—30 к., 3 м.—80 к., 6 м.—1 р. 50 к., 12 м.—3 р.

„Стройка“ з прыклад. 4 альбомаў „Строит. СССР“ 3 м.—1 р. 80 к., 6 м.—3 р. 50 к., 12 м.—6 р. 50 к.

„Стройка“ з прыклад. альманаху „Ленинград“ 3 м.—3 р., 6 м.—6 р., 12 м.—11 р. 50 к.

Растэрміноўка: 1 студз.—4 р., 1 крас.—3 р., 1 ліп.—3 р., 1 кастр.—1 р. 50 к.

„Стройка“ з прыклад. альманаху „Ленинград“ і 12 кніг савецкіх пісьменьнікаў 3 м.—3 р. 80 к., 6 м.—7 р. 50 к., 12 м.—14 р. 50 к.

Раст